Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 106 (29728)

БАЦЬКОЎСТВА — ІХ ПРЫЗВАНЕННЕ

Сямейная дата

СЕМ СТАДЫЙ МУЖЧЫНСКАГА КАХАННЯ

Сямейная дата

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Тое, як складзецца будучыня нашых дзяцей, залежыць толькі ад нас, таму падтрымка сем'яў з дзецьмі, захаванне і ўмацаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў — прыярытэтныя кірункі сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. Пры гэтым бацькі павінны ісці ў тандэме з дзяржавай. Так, у абноўленай Канстытуцыі з'явіўся вельмі важны дадатак: бацькі абавязаны рыхтаваць сваіх дзяцей да грамадска карыснай працы, прывіваць культуру і павагу да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі. Дзяржава забяспечвае прыярытэт выхавання дзяцей менавіта ў сям'і. Для дзетак з інваліднасцю, дзяцей-сірот гэтыя словы набываюць асаблівы сэнс. Яны ўдвая маюць патрэбу ў клопаце і бацькоўскім цяпле».

Незвычайная калекцыя



На падворку аграсядзібы «У Мароза» з вёскі Талуі Маладзечанскага раёна сабрана вялікая калекцыя даваенных сячкарняў. Гаспадар сядзібы Уладзімір МАРОЗ доўгі час збіраў іх па вёсках і мястэчках, набываў у нашчадкаў былых гаспадароў хутароў. Сто дваццаць сем — такая дакладная лічба гэтых жалезных механічных агрэгатаў, якія цяпер выстаўлены ўздоўж агароджы і якія можна паглядзець кожнаму ахвотнаму. Тут ёсць экземпляры з Амерыкі, Англіі, Польшчы, Прыбалтыкі. Але самы каштоўны — драўляная сячкарня з дубу, якой амаль дзвесце гадоў. «Марозаўскую» калекцыю лічаць самай вялікай у Еўропе.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Конкурс на самага экадружалюбнага фермера года стартаваў у Беларусі.**
- Магілёўскія мытнікі спынілі вываз з тэрыторыі Беларусі 33 тон мясной прадукцыі.
- **Камп'ютарную тамаграфію ўкараняць сёлета ў Камянцы, Драгічыне і Ляхавічах.**
- Вялікая бард-рыбалка пасля перапынку вяртаецца на берагі Чыгірынскага вадасховішча. Папулярны фестываль сёлета пройдзе з 29 да 31 ліпеня.

Арэнда жылой нерухомасці

ПАЧЫНАЕЦЦА СЕЗОН ЛЕЦІШЧАЎ, ПАКУЛЬ ЁСЦЬ І НЕДАРАГІЯ

У свой час, як толькі долар пайшоў уверх, кватаранты запатрабавалі зніжку, а некаторыя і зусім былі вымушаны пакінуць займаныя метры, бо гаспадары цану не скідвалі. Цяпер рубель умацаваўся, але былы спакой на рынак вяртаецца павольна. Намецілася тэндэнцыя, калі на рынку арэнды жылля Мінска з'яўляюцца новыя сезонныя рабочыя. Цікава, ці паўплывала гэта на цэны, а таксама на даступнасць для кватарантаў усіх тыпаў кватэр? За колькі цяпер здаецца жыллё ў Мінску і ці ёсць на яго попыт? У тым ліку і на дачы.

ЗУСІМ ТАННЫЯ КВАТЭРЫ ЗНІКЛІ

Мы яшчэ памятаем, як 30—45 дзён таму на сталічным рынку арэнды сталі з'яўляцца жыллёвыя аб'екты ў не зусім зручных месцах, але па цане 140 долараў па курсе. Кватаранты тады яшчэ носам круцілі, выбіралі кватэру як мага лепшую. Прайшоў месяц, і зусім бюджэтныя кватэры былі «вымыты» з рынку. Зараз па самым мінімальным цэнніку здаюцца аднапакаёвыя кватэры за 160 долараў. Гэта кватэры ў маласямейцы альбо стандартныя памяшканні са старой мэбляй мінулага стагоддзя. За 170 долараў цяпер можна адшукаць амаль новую кватэру абсалютна без мэблі. Бюджэтным у Мінску лічыцца і аднапакаёвае жыллё з цэннікам да 200 долараў па курсе.

СТАР. 3

Вандруем па краіне

АКУНУЦЦА Ў ГІСТАРЫЧНУЮ ЭПОХУ

Куды і як накіраваць турыстычныя патокі?

Паступова Беларусь прырастае новымі пунктамі, гатовымі прыняць турыстаў. Не маюць патрэбы ў рэкламе айчынныя санаторыі. Дынамічна развіваюцца экалагічны, медыцынскі, прамысловы напрамкі турызму. Ствараюцца новыя маршруты. Так, да прафсаюзнага турыстычнага форуму «Спадчына Беларусі» было распрацавана больш за дзве сотні маршрутаў. Музеі, цэнтры культуры і творчасці, аграсядзібы, прадпрыемствы і турфірмы прэзентавалі свой патэнцыял і дэманстравалі, як могуць напоўніць падарожжы ўражаннямі — інтэрактыўнымі праграмамі, знаёмствамі, фестывалямі, прадуктамі, зробленымі па традыцыйных і сучасных рэцэптах, майстар-класамі, падарункамі рамеснікаў. Тут жа прэзентаваліся і артэфакты, прывезеныя з розных куткоў Беларусі: факсімільная копія Берасцейскай Біблії, копія крыжа Ефрасінні Полацкай, паштоўка з вершам Максіма Багдановіча, якая пабывала ў космасе (яе ў фонды Літаратурнага музея Максіма Багдановіча перадаў ураджэнец Беларусі касманаўт Алег Навіцкі).

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Станоўчыя эмоцыі — маленькім пацыентам

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Сустрэча з маленькімі пацыентамі медыцынскай установы была прымеркавана да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

Па словах спікера верхняй палаты парламента, гэта ўнікальны цэнтр, дзе лечацца дзеці не толькі з нашай краіны, але і з-за мяжы. «Захворванне няпростае, і, вядома, яно патрабуе працяглага знаходжання ў дадзенай установе, — заўважыла Наталля Качанава. — Створаны ўсе ўмовы, каб тут маглі знаходзіцца і дзеці, і бацькі. Прэзідэнт, наведваючы гэты цэнтр, паставіў задачу будаўніцтва новага корпуса, бо трэба пашыраць паслугі. Мы бачым, што вельмі шмат прыязджае з-за мяжы да нас бацькоў з дзецьмі, каб прайсці якаснае і кваліфікаванае лячэнне».

Падкрэсліўшы, што ў цэнтры працуе выдатны калектыў, Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала людзям, якія робяць усё, каб нашы дзеці паправіліся і жылі паўнавартасным жыццём. Пацыентам РНПЦ Наталля Качанава перадала салодкія падарункі і наборы для творчасці.

Паводле БелТА.

Юныя патрыёты

ПАСПЫТАЦЬ МІЛІЦЭЙСКАЙ ПРАФЕСІІ

У Акадэміі МУС пачаў сваю работу ваенна-патрыятычны лагер «На варце»

Галоўная міліцэйская ўстанова краіны ўпершыню стала пляцоўкай, на якой падчас летніх канікул будуць праводзіць час школьнікі. Мінскіх старшакласнікаў чакае вельмі насычаная праграма. На працягу месяца яны будуць знаёміцца з тонкасцямі прафесіі міліцыянера: паспрабуюць сябе ў ролі следчага, эксперта-крыміналіста, паглыбяцца ў адукацыйны працэс і нават наведаюць вучэбныя палігоны акадэміі.

Акрамя таго, для школьнікаў (а гэта каля 250 хлопцаў і дзяўчат) прадугледжана і культурная праграма. У прыватнасці, яны наведаюць музей міліцэйскага ведамства. Хлопцы з нецярпеннем чакаюць, калі пачнуцца заняткі па агнявой падрыхтоўцы, а дзяўчаты з задавальненнем наведаюць псіхалагічны трэнінг: нават не будучы праваахоўнікам, карысна ўмець па паводзінах чалавека распазнаць злачынцу. Увесь гэты час удзельнікі ваенна-патрыятычнага лагера будуць мець стасункі з курсантамі і выкладчыкамі Акадэміі МУС.

«Ваенна-патрыятычны лагер «На варце» ўнікальны для нашай установы адукацыі: ён у нас праводзіцца ўпершыню, і сімвалічна, што ў Год гістарычнай памяці, — адзначае **намеснік начальніка Акадэміі МУС па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Руслан ЦЯСЛЕНКА**. — Нягледзячы на непрацяглую змену даўжынёй у тры тыдні, кожны дзень будзе напоўнены цікавымі мерапрыемствамі. Упэўнены, што хлопцы і дзяўчаты будуць задаволены і вынесуць для сябе шмат цікавага і карыснага. Перш за ўсё, мы хочам удзяліць увагу выхаванню падлеткаў у парадыгме грамадства, дзяржавы, Радзімы, гатоўнасці кожнага грамадзяніна зрабіць усё, што ад яго залежыць, для развіцця нашай краіны. Калі ж у выніку некаторыя з гэтых людзей у далейшым паступяць у акадэмію, мы будзем толькі рады».

Як расказвае **дырэктар сярэдняй школы № 122 г. Мінска Людміла ЛОЙКА**, паколькі на базе галоўнай міліцэйскай ВНУ краіны лагер функцыянуе ўпершыню, дзеці вельмі хацелі ў яго трапіць. «Ім цікава адчуць сябе ў ролі курсанта акадэміі на працяглы прамежак часу, — заўважае кіраўнік навучальнай установы. — Хочацца верыць, што ў Акадэмію МУС мы прывялі будучае папаўненне».

Як прызнаецца **вучань 7 класа сярэдняй школы № 148 Аляксандр ГАРКУН**, не выключана, што сваё жыццё ён звяжа з праваахоўнымі органамі, таму пабыць у такім лагеры для яго — адзін з крокаў на шляху да мары. «Мне цікава даведацца, які ў курсантаў распарадак дня, як яны вучацца, чым займаюцца ў вольны час, — кажа школьнік. — Найбольшую цікавасць уяўляе крыміналістыка. Падчас лагера будзе магчымасць пазнаёміцца з гэтым відам дзейнасці бліжэй».

Вучаніца 7 класа сярэдняй школы № 122 Арына ДАВЫДЗЕНКА даведалася аб існаванні лагера на базе Акадэміі МУС ад кіраўніка па ваенна-патрыятычнай падрыхтоўцы. «Цікава навучыцца пэўным псіхалагічным прыёмам: напрыклад, умець распазнаваць, што табе хлусяць, — гаворыць дзяўчынка. — А яшчэ ў лагеры хачу авалодаць некаторымі прыёмамі самаабароны. Пра будучую прафесію пакуль не думала. Магчыма, акурат ваенна-патрыятычны лагер дапаможа мне вызначыцца з выбарам».

Знаходжанне школьнікаў у сценах міліцэйскай альма-матар завершыцца іх удзелам ва ўрачыстай цырымоніі выпуску на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Хто ведае, магчыма, хтосьці з іх вернецца сюды ўжо ў якасці курсантаў.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы Акадэміі МУС.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША заявілі, што Байдэн не справіцца з інфляцыяй з-за яго некампетэнтнасці

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн не зможа справіцца з інфляцыяй, бо агучаныя ім планы па барацьбе з ёй толькі паказваюць яго некампетэнтнасць. Пра гэта заявіў аглядальнік The Washington Post і старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра этыкі і грамадскай палітыкі Генры Олсен.

«Прэзідэнт Байдэн нарэшце выклаў свой план барацьбы з інфляцыяй. Але гэтая стратэгія дэманструе тое, пра што многія даўно падазравалі: ён паняцця не мае, што рабіць з ростам цэн», — адзначыў Олсен.

Паводле яго слоў, большасць прапаноў амерыканскага лідара немагчыма рэалізаваць. Па большай частцы Байдэн проста перакладае адказнасць на іншыя органы або галіны. Напрыклад, ідэя даць кантроль за інфляцыяй Федэральнай рэзервовай сістэме з'яўляецца прыкметай бездапаможнасці.

Ён дадаў, што паляпшэнне інфраструктуры дзеля зніжэння цэн на энерганосьбіты не толькі не зменшыць узровень інфляцыі, але і яшчэ больш павысіць яе. Акрамя таго, на рэалізацыю такой задумы спатрэбіцца шмат гадоў і вялізныя ўкладанні.

Зяленскі: Украіна штодзень страчвае 60—100 ваенных забітымі і каля 500 параненымі

Украіна штодзень страчвае ў ходзе расійскай спецаперацыі амаль 60—100 салдат забітымі і амаль 500 параненымі, заявіў прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі ў інтэрв'ю тэлеканалу Newsmax, паведамляе ТАСС.

Паводле слоў Зяленскага, сітуацыя на ўсходзе краіны вельмі цяжкая. «Мы штодзень страчваем ад 60 да 100 салдат забітымі і каля 500 чалавек параненымі ў баі», — сказаў ён.

Украінскі кіраўнік адзначыў, што ўкраінцы ва ўсходняй частцы краіны «ўтрымліваюць перыметр абароны», а ў Харкаўскай вобласці «контратакуюць і аказваюць націск».

Ён таксама заявіў, што Украіна не будзе саступаць свае тэрыторыі, але можа абмяркоўваць звязаныя з імі складанасці. Зяленскі лічыць, што дыскусія неабходна, каб пачаць вырашаць гэтыя складанасці і выклікі, у адваротным выпадку нічога не атрымаецца.

Па сутнасці

ПАДМУРАК КРАІНЫ

Недзе сустрэў такое вызначэнне: «Беларусь — краіна шчаслівага дзяцінства». І гэта сапраўды так. У Беларусі гэта аксіёма. Дзеля дзяцей жывуць не тое што сапраўдныя бацькі, нават дзядулі і асабліва бабулі. Беларусы ў паважаным узросце збіраюць грошы не на падарожжа па свеце. Замест сэлфі сярод Альпаў альбо каля Эйфелевай вежы нашы старыя на самым бачным месцы выстаўляюць фатаграфію з унукамі.

Але ж некаторыя нават кпяць з гэтага. У іх разуменні «пэрамэны» павінны былі адбыцца нават у поглядах беларускіх пенсіянераў. Маўляў, яны з дбайных гаспадароў павінны былі ператварыцца ў міжнародных валацуг. А ці не здаецца вам, што вось гэтыя замежныя падарожжы — гэта спроба не адпачынку (дарогу і нават нязначную змену клімату і моладзь адчувае — што казаць пра людзей ва ўзросце), а ўцячы ад сябе. Калі замест дзіцячага гоману ў пакоях у галаве сталых людзей звініць пытанне: а які ён, вынік жыцця для сябе, на «лайце», па-еўрапейску? Разумееш гэта, калі памылкі нельга выправіць. Так мо яно і трэба адрывацца бабулям і дзядулям ад сваіх кветнікаў і агародаў, «адрывацца» і ў сэнсе слэнгу ўнукаў. Адпачыць, змяніць дзейнасць і гэтак далей. Але ж галоўнае — не адарвацца ад радавога запавету. Аб прадаўжэнні гэтага самага роду.

Нам, сучаснікам, цяжка нават уявіць, якія выпрабаванні цярпелі беларусы на сваёй зямлі, пакуль свая зямля не стала сваёй у межах асабістай дзяржавы. Але ж беларусы засталіся ў свеце. Не зніклі ў скляпеннях дэфензівы, на папялішчах Хатыні, падчас радыяцыйнай навалы. Выжылі. Засталіся. Жывём поўным сэрцам. Дзякуючы працягу роду. Кажуць, што пасля вайны — заўжды ўсплёск нараджальнасці. Нястача, галеча, але ж ніякіх табе дэмаграфічных ям. Пяцёра-шасцёра дзяцей у кожнай сям'і. У сялянскай хаце не больш чым два жылыя пакоі, жыллё па-гарадскому — увогуле адна кухня на некалькі сем'яў. Дэфіцыт, канфлікты былі. Але нараджэнне дзіцяці адзначалі вясковай вуліцай, гарадскім пад'ездам. Зараз нават лавак у невялікіх вёсках няма. Не пасуюць сучаснай агароджы. І ў такіх умовах выраслі, атрымалі адукацыю і знайшлі сябе. У пакаленя родам з 1940—1980-х амаль няма так званых свабодных мастакоў. Сапраўдныя мастакі былі Бялыніцкі-Біруля, Міхаіл Савіцкі. Не было цукерак, не хапала падручнікаў, але ж была прага да жыцця. Таму нараджалі дзяцей. І выхоўвалі. Без памперсаў і мацярынскага капіталу. Не было ні сацыяльных педагогаў, ні гендарных факультатываў — быў нараджальны бум. Пакуль не пачалі лепей жыць.

Памятаеце фільм «Белыя росы»? Фільм-люстэрка эпохі развітога сацыялізму. Буслянка дзеля больш камфортных умоў пад бульдозер. А бусел — гэта жаданы госць у кожнай сям'і. Як толькі пыльныя вясковыя вуліцы заасфальтавалі, а хаты зацьмілі шматпавярховымі будынкамі, галоўнае адышло ў цень. Сталі губляць запаветы продкаў і дзяцей па паліклініках. Багацце любога народа. Кажучы па-дзяржаўнаму, галоўны рэсурс краіны. На гэта любых грошай не шкада. Як і на бяспеку краіны.

Але ці вырашае матэрыяльнае заахвочванне праблему? Мацярынства за грошы — нібыта сурагатны бізнес. Ці ўвогуле можна купіць шчасце быць маці? Я не пра ЭКА. Пра адчуванне таго, што ты падаравала жыццё. Абавязкова трэба падтрымліваць свядомых шматдзетных бацькоў. Але ці можна грашыма выхаваць тых дарослых, хто ўвогуле не займаецца выхаваннем сваіх дзяцей.

А чаму б, напрыклад, не заснаваць медаль Маці — за траіх дзяцей. Зразумела, ордэн Маці — за выхаванне пяцярых. Дык вось такія ўзнагароды даюць менавіта паважаным жанчынам за насамрэч добра выхаваных дзяцей. Вось менавіта ўзнагароджаным у першую чаргу і няхай дапамагае дзяржава. Тады некаторыя бацькі перастануць родных дзяцей ператвараць у сродак маніпулявання і заробку.

Бо насамрэч дзяржава ў нас шмат увагі ўдзяляе падтрымцы мацярынства і дзяцінства. Зараз аб вельмі цяжкім. Аб смяротнасці. Нашы ўрачы нібы чараўнікі — навучыліся адваёўваць жыццё немаўлят, што ўмяшчаюцца ў іх далонь. У Еўропе нават такія, прабачце, «плады» па-за ўлікам статыстыкі. Вось і атрымліваецца: дзяржава, нібы родная маці, пыхціць над кожным немаўлём. І нават каля галоўнага будынка суверэнітэту — Палаца Незалежнасці — РНПЦ «Маці і дзіця». Гэтая ўрбаністычная дэталь — быццам рыса дзяржаўнай палітыкі.

Але ж ці можна праграмамі ды інструкцыямі, банкаўскімі рахункамі і дзяржаўнымі данатамі ажывіць жыццёвую прагу да працягу роду. Падтрымаць — так! Але ж ажывіць? Гэта як рака. Можна з дапамогай меліярацыі змяніць рэчышча, нават зрабіць больш паўнаводнай, але без невычэрпных падземных вытокаў нават маленькая рачулка высахне да дна. Так і з нараджэннем дзяцей. Без нацыянальнага жадання застацца ў гісторыі — ніяк.

А цяпер падумайце, чаму так навязваюць жахлівую ідэалогію «чайлд фры» — бяздушную моду на бяздзетнасць. Брытанскія газеты ўжо не саромеюцца апавядаць пра таксічнасць дзяцей, украінскія дэпутаты нават прапаноўвалі стэрылізаваць бедных жанчын.

А колькі «экспэртаў» з міжнародных фондаў займаюцца рэгуляванне нараджэння. Яны вам раскажуць і пра закабалённае мацярынствам жанчын, і пра моду на адукаванасць і сталасць бацькоў, нават цягу да міжнароднага турызму і «дэмакратызацыю» сямейных адносін. Мараль адна — займайцеся чым заўгодна, але не нараджайце дзяцей. Канцэпцыя нічым не адрозніваецца ад трэцяга рэйху — захоп жыццёвай прасторы. Зараз без адзінага стрэлу.

Мы шмат чаго страцілі свайго роднага-побытавага. Нават аўтэнтыку сялянскай сядзібы — хату бацькоў — альбо ўвогуле зносім — на дровы, альбо... А ў гэтых сценах моц не толькі адмысловай смалістай драўніны, пах лесу, у гэтых сценах — гісторыя нашых сем'яў. Гісторыя перамог. Над нястачай, над акупантамі. Гісторыя свайго роду. А мы хату бацькоў еўрапеізуем. Добра, што пасля гэтага суцэльнага «еўрарамонту» ў агульнай хаце застаецца месца для калыскі для нашых дзяцей. А ў чырвоным кутку палітычнай рэчаіснасці — не постмадэрнісцкі кіраўнік, а вобраз сапраўднага бацькі.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ПАЧЫНАЕЦЦА СЕЗОН ЛЕЦІШЧАЎ, ПАКУЛЬ ЁСЦЬ І НЕДАРАГІЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Злёгку падняўся цэннік і для двухпакаёвых кватэр. Цяпер цана на іх пачынаецца з 220 долараў. Месяц таму было на 20 долараў меней. Аднак у спальных раёнах не зусім ліквіднае такое жыллё прапануецца па кошце 230—250 долараў. Стандартныя двухпакаёвыя кватэры з сучаснай мэбляй і бытавой тэхнікай зараз здаюцца не танней чым за 300—320 долараў па курсе. Паводле статыстыкі, самы вялікі цэннік на кватэры ў Мінску трымаецца ў раёне «Новай Баравой», станцыі метро «Усход», у цэнтры і мікрараёне Лебядзіны. Танней за ўсё сыходзяць кватэры ў Ангарскай, Дражні, раёне вуліцы Казінца, Навінках, а таксама ў пасёлках Сокал і Сосны.

Але, нягледзячы на гэта, агульная тэндэнцыя, на думку аналітыкаў, практычна не змянілася. Прычына — рынак перапоўнены кватэрамі ў той момант, калі арандатараў з кожным днём усё менш. Студэнты ўжо сядзяць на «чамаданах», а новы сезон «свежых» студэнтаў яшчэ не наступіў.

КВАТЭРЫ НА СУТКІ ЗНОЎ У ТРЭНДЗЕ?

Нягледзячы на недахоп кватарантаў, не ўсе ўласнікі гатовыя ісці на саступкі, вынік — мноства кватэр завісаюць у рэкламе, а таксама сыходзяць у разрад кватэр на суткі. Справа ў тым, што ў другой палове мая ў Мінску назіраўся самы сапраўдны бум на прыватныя, пасутачныя кватэры.

Кажуць, у майскія святы ў Мінску зноў (як у найлепшыя гады) немагчыма было знайсці свабодную кватэру на суткі. Гэта да нас пасля амаль двухгадовага коўднага перапынку вярнуліся турысты з Расіі. Больш за тое, у Беларусь паехалі і жыхары балтыйскіх краін. І, сапраўды, напярэдадні майскіх свят кватэры на суткі разыходзіліся як гарачыя піражкі.

У пікавыя дні знайсці свабоднае арэнднае жыллё ў сталіцы было практычна немагчыма, а цэны на пакінутыя варыянты раслі проста на вачах. Ажыятаж быў такі, што 7 мая цэны на кватэры даходзілі да 140 долараў за суткі. І людзі былі гатовыя засяліцца хоць куды, па любых цэнах. Пры гэтым яшчэ 1 мая гэтыя ж кватэры здаваліся за 70 долараў, і ніякага ажыятажу не было.

Унікальнасць сітуацыі ў тым, што калі раней людзі браніравалі святочныя даты за месяц-два, то зараз гэта адбылося літаральна за некалькі дзён. Расіяне казалі, што засумавалі па Мінску, два гады тут не былі. Многія пасля сталіцы ехалі ў іншыя месцы — у Брэст, Белавежскую пушчу, Брэсцкую крэпасць. Хтосьці сумясціў адпачынак з рабочымі пытаннямі, шопінгам, сустрэчамі з сябрамі і сваякамі. Адны хлопцы з Расіі прыехалі на пару дзён, але ім так спадабалася ў Мінску, што яны ўжо забраніравалі кватэру на два тыдні ў ліпені.

Акрамя расіян, павялічылася ў Мінску і колькасць гасцей з краін Балтыі. Для грамадзян гэтых дзяржаў дзейнічае бязвізавы ўезд у Беларусь, і многія вырашылі скарыстацца гэтай магчымасцю.

ПЕРШЫЯ ДАЧЫ: ЧЫМ БЛІЖЭЙ, ТЫМ ДАРАЖЭЙ

Перспектыва правесці ўсё лета ў душным горадзе мала каго парадуе. Аднак лецішча пад Мінскам, куды можна збегчы на выхадныя ад мітусні, ёсць не ва ўсіх. І тут добры варыянт — зняць участак з садовай хаткай у спецыяльным кааператыве або проста ў вёсцы.

Днямі абмяркоўвалі з калегам планы на лета. Яго сям'я вырашыла, што было б выдатна выхадныя праводзіць разам на прыродзе. Сваёй дачай пакуль абзавесціся не паспелі, і зняць домік здалося ім вельмі прывабным варыянтам. Знайшлі аб'явы ў інтэрнэце, патэлефанавалі, а ў адказ: участак здаём у арэнду толькі на цэлае лета.

На думку нашага эксперта, **ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктара агенцтва нерухомасці «БЕЛЦТН» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА**, зараз вялікая частка ўласнікаў дачных участкаў — людзі, якім ужо глыбока за 60. Часам даглядаць сваю загарадную нерухомасць не хапае здароўя. Дзеці і ўнукі часта не гараць жаданнем папамагаць у гэтым, але і ад ліквіднага аб'екта цалкам не адмаўляюцца.

«Зялёная» моладзь цікавіцца адпачынкам на прыродзе толькі ў разрэзе «адцягнуцца» на выхадныя і пажадана ў катэджы з усімі выгодамі. Адпачыў — і зноў у горад.

Так што цяпер досыць вялікая колькасць дачных домікаў і прасторных вясковых дамоў шукае сваіх кліентаў сярод нешматлікіх сямейных пар, у якіх ёсць свая аўтамашына і жаданне праводзіць час на прыродзе з абмежаваным наборам камфортнасці для гарадскога жыхара.

Прапаноў сапраўды маса. І проста адпачыць удалечыні ад мітусні, і ў агародзе пакорпацца, рыбу палавіць, пазагараць, у лес схадзіць, шашлыку паесці — варыянтаў безліч. Мы для сябе выбралі тры тыпы адпачынку пры бюджэтных выдатках.

Першы варыянт прадугледжвае невялікі жылы дом на два спальныя пакоі ў дачным кааператыве, побач з аграгарадком недалёка ад сталіцы (8 кіламетраў ад МКАД). Ацяпленне пячное, сезонная вада, каналізацыя цэнтральная. Амаль да самога дома ходзіць грамадскі транспарт, ёсць немаладая мэбля, няма ЗВЧ-печы, тэлевізара, але ёсць ванная і добрыя суседзі. Гаспадары кажуць, што спакойнае і ціхае месца. Такую амаль гарадскую дачу прапануюць за 250 долараў у эквіваленце на доўгачасовай аснове, але гатовыя і на варыянты супрацоўніцтва. Гэты домік добры тым, што з яго амаль у любы час можна трапіць у вялікі горад і назад.

Другі абраны мною варыянт знаходзіцца ў Мінскім раёне (15 кіламетраў ад МКАД). Гэта «лёгкая», не ўцепленая дача, якая здаецца толькі на летні сезон. Пажадана — сям'і, можна з дзецьмі. Плошча ўчастка невялікая — усяго 7 сотак, затое побач з тэрыторыяй лес і маляўнічае месца. Ацяпленне пячное, вада сезонная, а каналізацыя на вуліцы. Стан мэблі апісаны досыць проста: другаснае жыллё. У доме два пакоі і веранда, побач з участкам — сасновы лес, на ўчастку можна вырошчваць гародніну. Гэты просты варыянт ацэньваецца ўжо танней — 200 долараў у месяц.

Здаецца на працяглы тэрмін невялікі (два спальныя месцы) домік у аграгарадку Калодзішчы. Гэта як аднапакаёвая кватэра-студыя, дзе пакой сумешчаны з кухняй. У доме ёсць усе выгоды, але ацяпленне пячное. Уладкаваны кухня і прыбіральня, немаладая мэбля плюс пральная машына, ванны пакой, камін і паркоўка. На тэрыторыі — мангал, сад і агарод. Да Мінска на аўтамашыне — 20 хвілін, на аўтобусе — 30 хвілін. Пераважна сям'і з дзецьмі або маладой пары. Цана — 400 рублёў (155 долараў) плюс камунальныя плацяжы (максімум 100 рублёў). У дадзеным выпадку падкупляе тое, што ў хаце ёсць камфартабельны туалет і ванна-душ з гарачай вадой. Праўда, за гарачую ваду трэба папрацаваць.

У гэтай сітуацыі мы адабралі ўчасткі, размешчаныя недалёка ад Мінска, максімум за 20 кіламетраў: каб працэй было дабірацца туды пасля працоўнага тыдня ў пятніцу.

Калі выбіраць далей — кіламетраў 50—70 ад кальцавой дарогі, — то на дадзены момант існуюць прывабныя дачныя домікі, за якія ўласнікі просяць наогул дробязі — 50—60 долараў у эквіваленце. У цэлым усе ўладальнікі дач, да якіх мы звярнуліся, хацелі б здаць домік на лета. Адзін, асабліва рупліві з іх, так апісаў свае чаканні: «У мяне гэтым летам не атрымаецца часта бываць на дачы. Таму не бачу сэнсу не падарыць камусьці задавальнення. Натуральна, мне зручна здаць участак на цэлае лета адной сям'і. Леціша — сваё, асабістае, і не хацелася б перадаваць з рук у рукі».

Разам з тым большасць арандадаўцаў гатовая да дыялогу. А значыць, баркі пры жаданні змогуць знайсці рашэнне, пры якім ім не прыйдзецца моцна ахвяраваць сваімі інтарэсамі.

ЦІ ЁСЦЬ ПОПЫТ НА ЭЛІТНАЕ ЖЫЛЛЁ?

Нягледзячы на агульны стан рынку, эксперт адзначае: попыт на элітныя кватэры пакуль ёсць. Дарагое жыллё кропкава разбіраюць арандатары з-за мяжы, але і тут ёсць момант.

Жыллё з рамонтам з 2000-х, якое раней здавалася за 1000—2000 долараў па курсе, сёння мала каго прыцягвае за гэтыя грошы. Выключэннем могуць быць кватэры ў пэўных месцах горада і з рамонтам з якасных матэрыялаў.

Разам з тым добрым попытам карыстаюцца дыхтоўныя катэджы ў прыгарадзе. Людзі гатовыя здымаць загараднае жыллё пад Мінскам на лета за 800—1500 долараў у месяц, але гэта ўжо людзі крыху з іншымі даходамі.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСБАНК ЗНІЖАЕ ПРАЦЭНТНЫЯ СТАЎКІ ПА КРЭДЫТАХ НА НЕРУХОМАСЦЬ

З першых дзён лета вырашаць важныя жыццёвыя пытанні з гэтым банкам становіцца лягчэй і прасцей, бо яго крэдыты на будаўніцтва і набыццё жылля сталі больш даступныя.

Галоўная навіна найбуйнейшага банка краіны заключаецца ў тым, што з 1 чэрвеня гэтага года яго аддзяленні зніжаюць працэнтныя стаўкі да 19 % гадавых (стаўка рэфінансавання Нацбанка плюс 7 %) па нанава заключаных крэдытных дагаворах для дакрэдытавання грамадзян, якія заключылі ў банку крэдытныя дагаворы на фінансаванне нерухомасці з дзяржпадтрымкай. Наступнай добрай навіной стала зніжэнне да 21 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 9 %) кошту крэдыту для грамадзян, якія заключылі дагаворы на будаўніцтва жылля з дзяржаўнымі заказчыкамі (забудоўшчыкамі). Гэтая інфармацыя ў асноўным закране сацыяльна неабароненыя катэгорыі насельніцтва, якія будуюць і адначасова стаяць у чарзе на атрыманне жылля.

Акрамя таго, банк дае магчымасць скарыстацца партнёрскай праграмай «Іпатэка з намі» з новымі партнёрамі-забудоўшчыкамі: РУП «Галоўнае ўпраўленне капітальнага будаўніцтва» Упраўлення справамі Прэзідэнта і КУДП «Упраўленне капітальным будаўніцтвам Горацкага раёна». Пры гэтым стаўка па крэдыце «Іпатэка з намі» будзе ад 12 % (стаўка рэфінансавання) гадавых.

І яшчэ гэты банк, улічваючы складаную эканамічную сітуацыю, вырашыў падтрымаць сваіх кліентаў. Цяпер па крэдытах на фінансаванне нерухомасці, якія былі аформленыя сёлета з першага сакавіка да 31 мая, да канца бягучага года будзе прымяняцца фіксаванае значэнне стаўкі рэфінансавання Нацбанка — 9,25 %.

Прэс-служба Беларусбанка нагадвае, што, акрамя гэтага, па-ранейшаму можна скарыстацца адтэрміноўкай па пагашэнні асноўнага доўгу на тэрмін да 6 месяцаў з прадаўжэннем тэрміну вяртання крэдыту на 12 месяцаў. А даведацца падрабязнасці, а таксама азнаёміцца з умовамі крэдытавання можна на сайце belarusbank.by або па тэлефоне кантакт-цэнтра 147.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by**
Продавец	**ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», 200004, г. Минск, ул. Мельникайте, 2-10, 10-й этаж**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона

Наименование	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
Лот № 1 – магазин (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 696,6 кв. м, инвентарный номер 500/С-25388, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Петра Глебки, 64А. **Обременение:** аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона. Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи о приобретении неотъемлемого имущества общей стоимостью 2 175,17 бел. руб.	**1 501 200,00**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 500000000006000203: предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания магазина общей площадью 0,0975 га	
Лот № 2 – кафе (помещение общественного питания), общей площадью 126,2 кв. м, инв. номер 200/D-140202, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Богатырёва, 8А-1	**288 100,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN). Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

Срок заключения договора купли-продажи	**5** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона**

Условия оплаты предмета электронных торгов

По лоту № 1: в течение 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.
По лоту № 2: в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи. **Предусмотрена рассрочка платежа на следующих условиях:** первоначальный взнос в размере 30 % осуществляется не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора. Оставшаяся сумма вносится равными долями ежемесячно в течение 60 календарных месяцев с месяца, следующего за месяцем заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – 1 % от цены продажи лота, по лоту № 2 – 2,5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 10.00 до 12.00 04.07.2022 г.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.07.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Сайт: www.cpo.by
Продавец: ОАО «Строймаш», ул. Рыбалко, д. 26, 220033, г. Минск
Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Лот № 1	Капитальные строения (с инв. номерами 500/С-3905, 500/С-61536, 500/С-67273, 500/С-67274, 500/С-53797, 500/С-53798, 500/С-53796) и иное имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 17
Начальная цена с учетом НДС 20 %	**2 293 627,68 белорусского рубля**
Минимальная цена, бел. руб. с НДС 20 %	**802 769,69 белорусского рубля**
Сумма шага аукциона	**114 681,38 белорусского рубля**

С полным перечнем имущества можно ознакомиться на электронной площадке ИПМ-Торги и на сайте организатора аукциона

Порядок ознакомления с предметом электронных торгов: осуществляется в рабочие дни с 9.00 по 16.00 – Николай Маркович, 8044-505-16-54

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Электронные торги проводятся в порядке, определенном постановлением Министерства экономики Республики Беларусь от 01.04.2019 № 9 (ред. от 20.05.2021) «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)» (вместе с «Инструкцией о порядке организации и проведения электронных торгов по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)»)

Организатор аукциона имеет право снять предмет электронных торгов с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Срок подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи Покупатель обязан подписать в течение 3 (трех) календарных дней с момента его получения, но не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить **затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 3 % от цены продажи** предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 09.00 до 16.00 16.06.2022.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов. Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.06.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

АКУНУЦЦА Ў ГІСТАРЫЧНУЮ ЭПОХУ

ПАЗНАННЕ ПРАЗ РЭЧЫ І АНІМАЦЫЮ

Коласаўскі музей дэманстраваў зборнік вершаў Якуба Коласа, які пабываў у космасе дзякуючы Пятру Клімуку ў 1975 годзе. У Год гістарычнай памяці музеі, бясспрэчна, будуць уплятацца ў экскурсійныя і пазнавальныя праграмы. І сёлета нельга абмінуць літаратурныя ўстановы: краіна святкуе 140-гадовыя юбілеі Коласа і Купалы. На гэты год запланаваны літаратурныя гасцёўні, прэзентацыі кніг, тэатральныя заняткі, майстар-класы, лекцыі з віртуальнай рэальнасцю.

Таксама сёлета мы адзначылі 1160 гадоў самага старажытнага горада Беларусі. Як паведаміў дырэктар Полацкага фізкультурна-спартыўнага клуба «Прыдзвінне» Аляксей Ванько, горад значна прырос анімацыйнымі праграмамі — госці тут змогуць акунуцца ў розныя гістарычныя эпохі. Напрыклад, падчас праграмы «Манетны двор» можна перанесціся ў XIV стагоддзе, даведацца пра тое, як жылі рамеснікі, і адчаканіць манету. Ёсць праграма з гістарычнай кухняй XVI стагоддзя. А можна завітаць у Дом друкара, дзе падчас тэатралізаванай праграмы адкрыць, чым жыў горад на мяжы XVI—XVII стагоддзяў, якія эканамічныя, палітычныя, адукацыйныя пытанні абмяркоўвалі яго жыхары, паназіраць, як працаваў друкарскі станок, і паўдзельнічаць у вырабе паперы па тагачасных тэхналогіях. Асаблівасць сёлетніх турыстычных праграм Полацка ў тым, што стаўка робіцца на адлюстраванне старажытнай атмасферы. Нават экскурсіі па горадзе могуць праходзіць з элементамі анімацыі — у мясцінах, звязаных з гістарычнымі асобамі, госці змогуць сустрэцца з Францыскам Скарынам ці Сімяонам Полацкім, паназіраць за сцэнкамі з жыцця гараджан, пачынаючы ад даты першай згадкі — 862 года — да сучаснасці.

ВЁСКА ЗАПРАШАЕ

Сёння ў краіне больш за тры тысячы аграсядзіб. Відаць, мы б не атрымалі такой вялікай лічбы, калі б дамкі на вёсцы прапаноўвалі толькі начлег і харчаванне. Госці сюды едуць па насычаныя ўражаннямі і адкрыццямі праграмы. Сёння гаспадары сядзіб кааперуюцца з калегамі, супрацоўнічаюць з музычнымі калектывамі і рамеснікамі, фермерамі. Развіваюцца кластары. Менавіта дзякуючы таму, што тут прапаноўваецца прадуманы турыстычны прадукт, беларускі агратурызм лічыцца адным з найлепшых у свеце. Некаторыя сядзібы прыстасаваліся пад прыём вялікіх груп на канікулы ці на выпускныя і рэканструкцыю народных свят, да іх пачалі ездзіць аўтобусы са школьнікамі.

Сярод такіх — аграсядзіба Дары Вялеса ў Пухавіцкім раёне. Тут распрацавалі 10 дзіцячых праграм: на Гуканне вясны, Камаедзіцу, Масленіцу і іншыя народныя святы. Для дзетак ладзіцца пазнавальная праграма, майстар-класы па пляценні паясоў і кулінарных сакрэтах, працуе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

кантактны заапарк. Гаспадары прапануюць уласныя прадукты: сыры, вэнджаніну, хлеб, робяць і «беларускія кіндары» — расісныя пернікі ў выглядзе яйка з сюрпрызам унутры.

Такім чынам раскручваецца беларуская вёска і прывіваецца попыт на народную культуру. Гараджане пачынаюць цікавіцца рамёствамі, абрадамі і традыцыямі. Тэхналогія і традыцыі выпякання хатняга хлеба ў вёсках Жораўка і Кузьмічы Любанскага раёна ў 2020 годзе набылі статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. І сёння ў многіх хатах гаспадыні пякуць хлеб, але ў Доме народных традыцый любы госць можа паўдзельнічаць у прыгатаванні ўласнага бохану.

РЭГІЁНЫ ПРАПАНУЮЦЬ

Калі каранавірус «затачыў» людзей унутры сваёй краіны, яны пачалі актыўна падарожнічаць па ўласнай зямлі. Натуральна, любы турыст хоча разнастайнасці. Тыя, хто аб'ездзіў ужо раскручаныя турыстычныя аб'екты, гатовы адкрываць новыя маршруты. Таму ва ўсіх рэгіёнах краіны пачаліся актыўныя пошукі новых пунктаў прыцягнення. Прафсаюзны форум «Спадчына Беларусі» стаў адной з пляцовак для прэзентацый такіх магчымасцяў.

Так, педагог Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Барысаўскага раёна Ілья Дайнека прэзентаваў водны маршрут выхаднога дня, які пралягае па напалеонаўскіх мясцінах, дзе французскі імператар перапраўляўся праз Бярэзіну. Турысты зазіраюць у Крычанскі сад, вёску Студзёнку, Брылёўскае поле, знаёмяцца з культурнай спадчынай Барысава.

У Смілавічах можна паглядзець на герояў партрэтаў Хаіма Суціна, якія ажылі. Мастак заўсёды маляваў з натуры. І супрацоўнікі музея «Прастора Хаіма Суціна», які размясціўся ў Цэнтры дзіцячай творчасці, пастараліся знайсці людзей, падобных на тых, якіх сустракаў у сваім жыцці іх знакамітыя зямляк, падабраць ім вопратку і прычоскі. Такія праекты сапраўды ўражваюць, музей карыстаецца папулярнасцю. Людзі едуць на радзіму выдатнага творцы, і сёння цяжка паверыць, што яшчэ нядаўна імя нашага земляка, аднаго са знакамітых мастакоў парыжскай школы, чые карціны ў свеце прадаюцца за шалёныя сумы, было малавядомым на радзіме. Дзякуючы такім праектам вырастае пакаленне, якому блізкая творчасць Хаіма Суціна. І гэта не толькі дзеці са Смілавіч, якія таксама перажывасабляюцца ў герояў з карцін мастака, але і шматлікія юныя госці. Кіраўнік музея «Прастора Хаіма Суціна» Таццяна Хасяневіч паведаміла, што дзеці са Смілавіцкага цэнтра творчасці таксама дэманструюць хусткі па эскізах яшчэ аднаго мастака парыжскай школы Шрагі Царфіна. Гэты ўраджэнец Смілавіч у Парыжы ствараў, акрамя карцін, узоры тканін для модных дамоў.

ПОШУК ПАДЫХОДАЎ

На лета прафсаюзны тураператар прапануе больш за 200 маршрутаў. Сярод іх ёсць прамысловыя, патрыятычныя, гастранамічныя туры.

Ужо складзена больш за пяць тысяч дамоў, па якіх працоўныя Беларусі паедуць адкрываць сваю краіну. У будучыні плануецца выйсці на лічбу каля мільёна падарожнікаў. Шмат спадзяванняў, што спрацуе ланцуговая рэакцыя: людзі, якія падарожнічалі напачатку са сваім калектывам, потым захочуць выправіцца ў вандроўкі самастойна, прыхапіўшы ўласныя сем'і. Спадзяванні на гэта выказаў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда падчас круглага стала, што адбываўся ў межах форуму. Ён упэўнены, што, калі чалавек вывучае гісторыю і культуру не з кніг, а з падарожжаў, у яго фарміруецца асабліваe стаўленне да сваёй зямлі. Сёння важна стварыць умовы, каб як мага больш людзей пачалі выбірацца ў такія пазнавальныя вандроўкі.

Падчас круглага стала абмяркоўваўся турыстычны патэнцыял і праблемы, якія ёсць у галіне. Паранейшаму на месцах не хапае кадраў. У абласных цэнтрах часам складана знайсці работніка з веданнем замежных моў на рэсепшн, менеджараў у бюро падарожжаў і экскурсій. Ёсць цікавыя раёны, куды гатовы паехаць турысты, але часам не хапае экскурсаводаў, гатовых з імі працаваць. Нават там, дзе маюцца ўнікальныя кадры, здольныя працаваць з турыстамі на месцах, немагчыма паставіць работу на паток. Што рабіць, калі ў гарачы сезон у рэгіён жадаюць адначасова прыехаць некалькі груп турыстаў, а пры гэтым там маецца толькі адзін экскурсавод?

Трэба далей паляпшаць інфраструктуру. Справа не толькі ў месцах для начлегу і харчавання — трэба прадумаць, каб на маршруце былі санітарныя прыпынкі, сувенірныя лаўкі. А што рабіць з аб'ектамі, дзе засталіся толькі рэшткі падмуркаў? Не кожны турыст гатовы ехаць глядзець такія мясціны. Хоць прафесійны харызматычны экскурсавод нават такія пункты зможа падаць, каб уразіць гасцей.

Асаблівасць сёлетніх турыстычных праграм Полацка ў тым, што стаўка робіцца на адлюстраванне старажытнай атмасферы.

Пакуль недастаткова ўвагі ўдзяляецца археалагічнаму турызму. Так, беларускім гісторыкам удалося адшукаць месца, дзе знаходзілася сядзіба Дастаеўскіх — продкаў сусветна вядомага пісьменніка (звесткі пра род сягаюць у XV стагоддзе). Падчас раскопак тут былі знойдзены матэрыялы XVI—XVII стагоддзя, у тым ліку кафля, геральдычныя элементы, якія пацвярджалі, якому роду належаў будынак. Сядзібу можна было б аднавіць, захаваліся падмуркі, і па іх таксама можна было атрымаць дадатковыя звесткі аб ранейшай пабудове. Была нават ідэя аб узвядзенні дома, але, як кажуць, не зраслося. І, тым не менш, турысты былі гатовы ехаць і ў чыстае поле, каб паглядзець на мясціны, звязаныя з родам Дастаеўскіх. І гэта пацвярджае, што такі кірунак турызму, як археалагічны, мае быць, трэба толькі падумаць, як яго падаваць.

Кандыдат гістарычных навук, экскурсавод Дзяніс Філіпчык акрэсліў праблемы, звязаныя з прэзентацыяй у турызме нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Праблема не толькі ў старэнні носьбітаў, але і ў слабай зацікаўленасці турфірм. Адна справа — паказаць спажыўцам аб'екты архітэктуры, іншая — падаваць рамёствы, кухню, абрадавае дзеянне. Тут патрэбна шмат часу выдаткаваць на наладжванне зносін з захавальнікамі традыцый, падладзіцца пад іх патрэбы і настрой, выкручвацца, калі носьбіты ў пэўны час не гатовыя прымаць гасцей (з-за хваробы ці ўласных праблем). Напрыклад, каб спячы знакамітую поразаўскую банкуху, трэба 60 яек і 18 гадзін стаяць каля агню. Зразумела, такі прадукт не паставіш на паток. Не хапае спецыялістаў, гатовых эфектна прэзентаваць нематэрыяльную спадчыну. Сёння актывізаваўся сямейны турызм, але ці даедуць такія госці да носьбітаў спадчыны, калі інфармацыі пра іх няма ні ў інтэрнэце, ні на шыльдах?

ІНКЛЮЗІЎНЫ МАРШРУТ

Яшчэ адно з пытанняў, якое абмяркоўвалася падчас круглага стала, датычылася інклюзіўнага турызму. Трэба разумець, што падобныя маршруты варта распрацоўваць не толькі пад людзей з інваліднасцю. Сем'і з каляскамі, састарэлыя, людзі з лішняй вагой таксама маюць патрэбу ў больш камфортных умовах. Насамрэч такія падарожнікі ствараюць даволі прывабны сегмент рынку. Яны засяляюцца на больш працяглы час. Выбіраюцца ў больш нізкі сезон, калі ў гасцініцах і сядзібах няма натоўпаў турыстаў. Калі знаходзяць месцы, дзе ім камфортна, прыязджаюць туды паўторна. Да таго ж людзі з інваліднасцю ў падарожжа выпраўляюцца звычайна не паасобку, а з сябрамі і сваякамі, і таму трэба прадумваць умовы і праграмы, цікавыя любой катэгорыі гасцей.

З 2018 года актыўна развіваецца турызм, звязаны з зонай адсялення і адчужэння. Больш за сотню груп наведала чарнобыльскія тэрыторыі ў Хойніцкім і Нараўлянскім раёнах. Такія маршруты запатрабаваныя ў замежных турыстаў. Адных цікавіць запаведная прырода, іншых — гістарычныя аб'екты ці дэталі, якія сведчаць пра трагедыю, звязаную з экалагічнай катастрофай.

Сёння распрацоўваюцца ў турызме тэрыторыі былых лагераў ваеннапалонных, дзе можна распавядаць пра пакуль малавядомыя трагедыі часоў Вялікай Айчыннай вайны, што адбываліся на нашай зямлі. Так, у Масюкоўшчыне захаваліся аб'екты Шталага 352, дзякуючы якім можна перадаваць атмасферу падзей вайны: баракі, сталовая, лазня, брукаванка, якую клалі ваеннапалонныя ў 1942 годзе. Музеефікацыя гэтай прасторы не патрабуе вялікіх сродкаў, дзякуючы стэндам з QR-кодамі і распрацаванай віртуальнай экскурсіі наведвальнікі змогуць самастойна вывучаць гісторыю. Тэрыторыю можна выдатна выкарыстоўваць для заняткаў са школьнікамі. Сярод ноу-хау — гістарычныя майстэрні, якія ладзяцца ў найбліжэйшых школах. Дзеці могуць удзельнічаць у квэстах — адшукваць прадмет, які мог быць звязаны з функцыянаваннем лагера, ці пры дапамозе трафарэтаў ствараць партрэты вязняў, з біяграфіяй якіх яны знаёмяцца. Тэрыторыя шталага можа стаць яшчэ адным з трагічных сімвалаў вайны і ўваходзіць у адпаведны тэматычны маршрут побач з Трасцянцом, які сведчыць пра месцы масавага знішчэння, Мінскім гета (знаёміць з тэмай Халакосту) і Хатынню, якая з'яўляецца помнікам спаленым вёскам.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Сямейная газета

Выпуск № 9 (191)

СЛЕД У ЧАЛАВЕКУ

Адна з нашых з сынам любімых гульняў узімку — пакідаць сляды на снезе ў выглядзе кветачкі, цягнічка, анёлка. Увесну ды летам мы таксама працягваем «слядзіць». Калі ідзём гуляць у лес ці да рэчкі, бяром з сабой пакет для смецця. Туды збіраем паперкі, шкло ды пластыкавыя бутэлькі, якія сустракаем на шляху. Тым самым пакідаем пасля сябе светлы след.

Пакідаць сляды на зямлі можна па-рознаму. Напрыклад, так, як нямецкі пісьменнік Іаган Вольфганг Гётэ. Чытала, што ён любіў браць з сабой на прагулку насенне, і там, дзе ішоў, паціху яго раскідваў. Праз нейкі час ён ужо шпацыраваў па сцяжынках, уздоўж якіх раслі кветкі. Альбо як турэцкі ляснік Хікмет Кая. Мужчына пры дапамозе вясковых жыхароў пасадзіў ажно 30 мільёнаў саджанцаў на бясплоднай зямлі. Прайшло сорак гадоў — і цяпер людзі могуць любавацца прыгожым зялёным лесам, які расце на пагорках, а не пустыняй.

Але ж, пагаджуся з Маяй Плісецкай, самае галоўнае — «пакінуць пасля сябе след у чалавеку». У якасці прыкладу падзялюся з вамі гісторыяй, якую некалі пачула ад знаёмага гештальт-тэрапеўта.

У краме дзяўчынка дапамагае маці выкласці прадукты перад касірам. Раптам пакет з просам падае на падлогу і лопаецца. Крупы амаль не высыпаліся. Але пакет пашкоджаны. «Ну вось, так і знала, — уздыхнула мама. — Нельга табе нічога даверыць. Рукі-крукі». На вочы дзяўчынкі навярнуліся слёзы. Яна цяпер не хоча нічога перакладваць. Яна — няўмека. Так сказала мама.

Мама, уся на нервах, пайшла па новы пакет проса. «Можаце даць мне цэлафанавы пакецік», — звяртаецца да касіркі жанчына (назавём яе Анёлам), якая стаяла наступнай у чарзе. А потым просіць дзяўчынку: «Дапамажы мне, калі ласка, сабраць проса».

Яны разам збіраюць з падлогі крупы ў цэлафанавы пакет. Мама дзяўчынкі вяртаецца і разлічваецца за пакупкі. «А што цяпер з тым просам, якое рассыпала ваша дачка? Хто за яе будзе плаціць? Я?» — нервуецца касірка. У паветры наспявае скандал.

«Я куплю гэтае проса, — умяшалася Анёл. — Пры ўмове, што ваша дачка дапаможа мне перакласці прадукты з каляскі. Так цудоўна ў яе гэта атрымліваецца! А ў мяне рука баліць». — «Так, Лідачка, дапамажы цёці. У яе рука баліць», — разгублена вымавіла маці.

Дзяўчынка ажывае. Пачынае акуратна перакладваць цётчыны прадукты. «Якая ў вас памочніца расце, — падыгрывае, гледзячы на маму Ліды, сталы мужчына з чаргі. Вось вырасце — адбою ад жаніхоў не будзе». Усе ў чарзе смяюцца.

Потым Анёл, дзяўчынка і яе мама разам выходзяць з крамы. «Ліда, а ты хочаш зараз апынуцца ў Венецыі? Там ёсць плошча, на якой шмат-шмат галубоў. І яны амаль ручныя. Садзяцца людзям на плечы, галаву». Анёл дастала з авоські цэлафанавы пакет з просам і са словамі «Ліда, ты вельмі сумна скінула проса. Яно нават амаль не рассыпалася. Кінь так, каб «бамс!» — і крупы разляцеліся ва ўсе бакі». Дзяўчынка азіраецца на маму. Тая ўжо ўсё зразумела, усміхаецца і ківае. Дзяўчынка радасна кідае пакет на зямлю. І ў тое ж імгненне, як у казцы, з дахаў і правадоў да ног Лідачкі кінулася процьма галодных галубоў. «Мама, глядзі, як іх шмат! Мама, яны ядуць наша проса. Мама, мы ў Венецыі». — «Дзякуй вам, проста ацверазілі. А то ў мяне сёння дрэнны дзень», — кажа мама Ліды і прыціскае радасную дачку да сябе.

...Гэта гісторыя для мяне не толькі пра светлы след, які зусім незнаёмы чалавек пакінуў у сэрцах маці і дачкі. Але і пра тое, што любую негатыўную сітуацыю заўсёды можна ператварыць у пазітыўную. Што дрэнны дзень у кожную хвіліну можа стаць добрым. А маленькая пляцоўка за крамай — Венецыяй.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Цёплы дом

Сям'я — з васямнаццаці «Я»

Як характары, не зломленыя лёсам, склаліся ў моцную каманду

«ТВАЕ» дзеці абавязкова знойдуць цябе... У гэтым перакананыя Галіна і Юрый ЯЎМЕНЕНКІ з вёскі Галавінцы Гомельскага раёна. У іх — 16 дзяцей, 11 з якіх — «народжаныя сэрцам». Іх гісторыя — пра тое, як характары, не зломленыя лёсам, склаліся ў моцную каманду дарагіх адно аднаму людзей.

Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

Гэтая незвычайная сям'я, якой сапраўды ганарацца ў Гомельскім раёне, нарадзілася ў 1997 годзе. Сужэнцы Яўмененкі, абое з сем'яў ваенных, прыехалі ў Беларусь з Камчаткі: у далёкім краі вайсковую службу праходзілі іх бацькі-афіцэры. Але менавіта Гомельшчыну — малую радзіму Юрыя — маладыя абралі, каб будаваць уласнае сямейнае шчасце.

— Нарадзілі пяцёра выдатных сыноў. На выдзелены дзяржавай ільготны крэдыт муж амаль цалкам самастойна пабудаваў прасторны і светлы дом, — расказвае Галіна. — Сыны падрасталі, добра вучыліся, займаліся спортам. Але, — усміхаецца, — адна думка не давала спакою: дачушкі не хапае.

У 2014 годзе Яўмененкі атрымалі статус прыёмнай сям'і, пайшлі ў дом дзіцяці знаёміцца з будучай дачкой, а вярнуліся дадому з дзвюма — Анастасіяй і Палінай.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Тваё асяроддзе

ПЕРАЗАГРУЗІЦЦА НА ДАБРЫНЮ

Што рабіць, каб у школьным жыцці не было булінгу і цкавання?

Зрабіць беларускія школы бяспечным месцам, дзе не будзе праяў булінгу, псіхалагічнага і фізічнага гвалту, мае на мэце праект «Сяброўскае і падтрымлівальнае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», які з 2020 года ахапіў 26 школ Беларусі. Сёлета на фестывалі «Школа, вольная ад гвалту (булінгу)» у аздараўленчым лагеры «Зубраня» падвялі яго першыя вынікі за два гады. Адзін з самых галоўных — распрацаваны дзецьмі Збор правіл жыцця ў школе, якія будуць выконвацца самімі вучнямі і пяройдуць у спадчыну малодшым. На думку спецыялістаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка, якія пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі рэалізоўваюць гэты праект, падобныя правілы варта ўкараніць ва ўсіх навучальных установах. А сярод планаў на наступныя тры гады рэалізацыі праекта — далучыць да актыўнага ўдзелу ў ім бацькоў і патлумачыць важнасць ролі педагогаў-псіхолагаў у школе.

Ток-шоу, псіхалагічны тэатр, партал пазітыву

За два гады навучэнцы кожнай са школ, якія ўдзельнічалі ў праекце, вучыліся ўзаемадзейнічаць і вырашаць праблемы мірна, па прынцыпе «роўны — роўнаму», а таксама арганізавалі мноства праектаў, з дапамогай якіх яны расказваюць аб праблеме булінгу і шляхах пераадолення.

Школьнікі стварылі старонкі ў сацыяльных сетках, знялі відэаролікі пра булінг. Відэа курсантаў Гомельскага кадэцкага вучылішча нават было адзначана спецпрызам на міжнародным конкурсе па правах чалавека ў Санкт-Пецярбургу. А вучні Бараўлянскай школы Мінскага раёна запусцілі на YouTube ток-шоу «Гаварыць аб праблемах не соромна», госці якога абмяркоўваюць праблемы, з якімі сутыкаюцца ахвяры булінгу, і разважаюць, чаму падлеткі становяцца булерамі.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Юрыдычная дапамога

Вам адкажа «АдвакОт»

Прававая адукацыя дзяцей і іх бацькоў па пытаннях, звязаных з дзяцінствам і яго абаронай, — такія мэты мела на ўвазе стварэнне чат-бота ў Telegram @ kids_lawyer_bot, які пазіцыянуецца як «Дзіцячы адвакат». Летам будзе два гады, як ён дапамагае маленькім і дарослым беларусам спраўляцца з надзённымі і набалелымі праблемамі. За гэты час адвакаты адказалі больш як на дзве тысячы пытанняў. А «АдвакОт» — мабільны дадатак, які з'явіўся нядаўна, аднак ужо цяпер праграму можна спампаваць і даведацца з яе шмат карыснага.

Як гэта працуе

Чат-бот скіраваны толькі на пазітыў і стварэнне, запэўніваюць **адвакаты Мінскай абласной калегіі адвакатаў Максім і Алеся ЦЕРАШКОВЫ,** якія адказваюць на пытанні ўсіх, хто піша ў чат.

Для зручнасці і разумення напачатку чат-бот паведамляе кожнаму карыстальніку, што ўсе атрыманыя звесткі і дадзеныя адказы застануцца ў межах гутаркі з дзіцячым адвакатам, а асабістая інфармацыя і кантакты нікому не перадаюцца і ахоўваюцца.

«Што мне рабіць?» — гэта не пытанне да адваката. Трэба апісаць сваю сітуацыю, указаць мэту, якой хочаш дасягнуць, звярнуўшыся па дапамогу».

Каб разумець, у якой форме лепш весці гутарку з чалавекам, які звярнуўся па дапамогу, яму прапануюць выбраць свой узрост з прапанаваных варыянтаў: да 14 гадоў, 14—16, 16—21 або старэйшы за 21.

Затым карыстальнік выбірае тэматыку пытання: «Жыллёвае заканадаўства»; «Скасаванне шлюбу»; «Утрыманне і выхаванне дзіцяці»; «Дзеяздольнасць. Эмансіпацыя»; «Узбуджэнне справы»; «Вядзенне следчых дзеянняў»; «Затрыманне, прымяненне меры стрымання»; «Прымяненне амністыі»; «Абскарджанне рашэнняў і дзеянняў упаўнаважаных асоб, суда».

— Вызначыўшы тэму, якая хвалюе, чалавек фармулюе і апісвае праблему сваімі словамі непасрэдна ў чаце. Ён можа быць упэўнены, што на тым баку чата знаходзіцца не робат, а жывы рэальны адвакат, які абавязкова адрэагуе на запыт індывідуальна, а не дашле дзяжурны адказ па шаблоне, — пракаменціраваў работу дадатку Максім Церашкоў, які ўзначальвае Мінскую абласную калегію адвакатаў. — Пад кожнае атрыманае пытанне мы падбіраем адпаведныя нарматыўна-прававыя акты і загружаем адказ у самы найбліжэйшы час. Адвакат — прафесія публічная, ён на сувязі пастаянна. У плане неабходнасці аказання экстраннай дапамогі гэтую прафесію пэўным чынам можна паставіць у адзін шэраг з ратавальнікам ці ўрачом.

Фармулюй зразумела!

Адвакаты ў адказе стараюцца даць паўнавартасную кансультацыю, аднак ёсць нюансы: яны не ацэньваюць працэсуальныя дзеянні іншых упаўнаважаных асоб па пэўных справах, таму што гэта некарэктна. Каб рабіць гэта, трэба дакладна ведаць матэрыялы справы, пазіцыю абодвух бакоў, а таксама валодаць адпаведнымі паўнамоцтвамі.

— Адвакат адстойвае пазіцыю свайго кліента ў пэўных выпадках перад іншай асобай: судом, упаўнаважанай асобай і іншым. Аднак даваць ацэнку іх дзеянням адвакат не можа, — падкрэсліў Максім Церашкоў. — Ён можа толькі патлумачыць парадак абскарджання, калі чалавек нечым незадаволены; параіць, што ўказаць у скарзе; расказаць, якія доказы трэба прадставіць, або падказаць, як законным шляхам атрымаць доказы. Наша задача — пракансультаваць па нескладаных пытаннях, дзе не трэба вывучаць мноства дакументаў, паколькі ў межах чат-бота гэта немагчыма тэхнічна і фізічна. Калі мы бачым, што сітуацыя складаная, і каб адказаць на пытанне, спатрэбіцца вывучыць дакументы, якія ёсць не толькі ў чалавека, але і ў розных інстанцыях, раім звярнуцца да адваката асабіста, каб ён глыбей унікаў у справу, і падказваем, дзе яго шукаць.

Практычна ўсе пытанні, што трапляюць у чат-бот, маюць дакладныя, лагічныя, зразумелыя і ветлівыя фармулёўкі, прычым 14-гадовыя падлеткі фармулююць свае пытанні на ўзроўні дарослых, падкрэсліў адвакат:

— Людзі часам нават выбачаюцца, што непакояць нас, хоць чат-бот і існуе, каб непакоіць. Далей яны дакладна і сцісла апісваюць сваю сітуацыю і абазначаюць, што хочуць зразумець у ёй. Аднак ёсць і іншыя прыклады, калі незразумела, чаго хоча чалавек. «Што мне рабіць?» — гэта не пытанне да адваката. Трэба апісаць сваю сітуацыю, указаць мэту, якой хочаш дасягнуць, звярнуўшыся па дапамогу. «Што рабіць падчас навальніцы?» — гэта не пытанне. Можа, вы хочаце энергію ад маланкі здабыць, а я вам буду апісваць, як ад гэтай маланкі схавацца. Так што трэба ўмець фармуляваць свае пытанні, каб мы маглі вам дапамагчы.

Расплата за зло непазбежная

Мабільны дадатак будзе ўдасканальвацца, абяцаюць адвакаты. Спецыялісты падкрэсліваюць, што гэта трэба не для таго, каб, ведаючы законы, дзеці маглі пазбегнуць адказнасці, а каб яны разумелі, што дабро вяртаецца дабром, а за зло настане непазбежная расплата.

— Наша задача — не ўплываць на свядомасць, а зрабіць так, каб чалавек усведамляў адказнасць, якая можа наступіць за яго пэўныя дзеянні пры няправільнай ацэнцы сітуацыі. Каб у яго не было спакусы пераступіць закон дзеля імгненнага абагачэння. Або ён не паддаўся парыву эмоцый і ў стане афекту не перакрэсліў сваё жыццё, выбраўшы няправільны ўчынак. У дасведчанага чалавека, у тым ліку таго, хто ведае элементарныя юрыдычныя моманты, больш шанцаў выйсці са складанай сітуацыі з найменшымі стратамі.

Калі падлетак, які звяртаецца ў чат-бот, робіць нейкае прызнанне, адвакаты раяць яму звярнуцца па пэўную дапамогу ў адпаведныя кампетэнтныя службы. А здараецца, што парады спецыялістаў у чат-боце цалкам ці ў большай ступені вырашаюць пытанне чалавека, які пасля ўзрушана дзякуе са словамі «А што, так можна было?».

— Тое, што адвакаты лічаць прапіснымі ісцінамі, можа стаць адкрыццём для звычайнага чалавека, — заўважыў Максім Церашкоў. — Аднак не трэба ўспрымаць наш адказ як указанне, што рабіць. Гэта толькі рэкамендацыя, бо чалавек, які звярнуўся ў чат-бот, мае больш інфармацыі па сваёй справе і вольны дзейнічаць, як лічыць патрэбным. Такое правіла дзейнічае і ў стасунках заяўніка з адвакатам у рэальным жыцці.

Не панацэя, а кірунак

Пытанняў, якія датычацца адміністрацыйна-крымінальнай адказнасці, у чат-боце — адзінкі, таму не ўсё так дрэнна, лічыць адвакат. Не было, прынамсі, пытанняў накшталт «мяне незаконна затрымалі». Людзі цікавяцца, якія правы ў непаўналетняга, на які тэрмін яго могуць затрымаць, максімальная адказнасць, якае пагражае за злачынства.

— Пыталіся, напрыклад, «як можна даказаць, што мы гэтага не рабілі?». Тут мы раім, па-першае, абавязкова звярнуцца да адваката, па-другое, тлумачым, якім чынам можна сабраць доказы, рэкамендуем афіцыйна напісаць следчаму і зарэгістраваць зварот. Сярод допісаў былі і «я не згодны з прыцягненнем да адміністрацыйнай адказнасці (штрафам)». Мы як адвакаты не можам ацаніць такое рашэнне, аднак можам параіць чалавеку абскардзіць яго і прывесці пэўныя і лагічныя аргументы сваёй нязгоды, а не проста напісаць скаргу «я супраць!». Рашэнні па справах таксама прымаюцца людзьмі, якія могуць памыляцца. Аднак шукаць рашэнне праблемы — найперш задача самога чалавека, а адказы адваката — не панацэя, а кірунак, як законным спосабам адстаяць свае правы.

Шмат пытанняў датычыцца грошай. Ухіляецца ад выплаты аліментаў — як іх спагнаць? Ці вызваляецца ад аліментаў асоба, якая з'ехала за мяжу? Як накіраваць выканаўчы ліст за межы Беларусі? З кім застануцца дзеці?

— У многіх дагэтуль чамусьці існуе стэрэатып, што матуля мае права абмяжоўваць бацьку ў стасунках з дзецьмі, і часам, калі таты скардзяцца на гэта адвакату, яны са здзіўленнем даведваюцца, што правы ў тат і мам на дзяцей абсалютна аднолькавыя, — дадаў спецыяліст. — І мы нагадваем бацькам, што нельга ў вырашэнні сваіх дарослых праблем выкарыстоўваць дзіця як інструмент, бо гэта створыць для малых неабарачальныя наступствы, з якімі яны мусяць потым жыць.

Дарослых хвалююць, напрыклад, пытанні працоўнага заканадаўства, а падлеткі пішуць аб праявах булінгу. Апошнім Максім Церашкоў, акрамя падтрымкі і парад аб дапамозе, заўжды нагадвае: «Ведай: калі табе плююць у спіну, значыць, ты наперадзе! Не трэба паддавацца на гэту праяву».

Адвакаты сцвярджаюць, што не закранаюць у сваёй працы глабальныя ці палітычныя пытанні. Ды і людзі звяртаюцца са сваімі «зямнымі» праблемамі, і для іх больш важны мікраклімат у сваёй сям'і, а не клімат на планеце.

Ірына СІДАРОК.

ІНТЭРАКТЫЎНЫЯ ГІСТОРЫІ «АДВАКОТА»

Чат-бот «Дзіцячы адвакат» убудаваны ў мабільны дадатак «АдвакОт», які можна спампаваць на тэлефон. Тут ёсць важная кнопка «знайсці адваката», націснуўшы якую можна пабачыць, які адвакат (а тут сабраны ўсе адвакаты краіны) найбліжэйшы да чалавека тэрытарыяльна і звязацца з ім. А можна перайсці па спасылцы непасрэдна ў чат-бот, каб задаць пытанне.

Асаблівасць «АдвакОт» у тым, што ён паказвае інтэрактыўныя гісторыі з сітуацыямі, у якія найчасцей трапляюць падлеткі, і з часам падобных ролікаў будзе больш. Напрыклад, кліп пра вечарынку ў кватэры, калі бацькі з'ехалі на лецішча, а дзеці паклікалі сяброў і гучна слухаюць музыку. У дзверы звоніць суседка, якой гэта перашкаджае... Глядач можа выбраць варыянт разгортвання падзей: не адчыняць, бо «навошта псаваць вечарыну», ці адчыніць і «паспрабаваць супакоіць суседку». Пакуль ідзе ролік, на экране паказваецца бягучы радок, дзе гаворыцца, у які час нельга шумець, тлумачыцца, што такое адміністрацыйнае правапарушэнне і якія вынікі яно мае для падлетка.

Такім чынам дзецям расказваецца, як трэба сябе паводзіць, чаго рабіць не варта і якое пакаранне можа наступіць. Інфармацыя падаецца без нуднай сухой юрыдычнай мовы і, галоўнае, без скажэння праўды, удакладніў Максім Церашкоў:

— Дзяцей, вядома, найперш павінны выхоўваць бацькі. Аднак гэты праект праз свае гісторыі таксама можа дапамагчы выхаваць у дзецях шчырасць і свядомасць. Здавалася б, ну што такога ў тым, каб праехаць бясплатна адзін прыпынак? Аднак з такіх дробязяў складаюцца і паводзіны чалавека, меркаванне пра яго як пра асобу.

Залежнасць ад фэйкаў

Вельмі важна, каб на пытанні, якія хвалююць, людзі атрымлівалі адказы ад спецыялістаў, падкрэсліў Максім Церашкоў:

— Не ўсе тыя, хто называе сябе праваабаронцамі, маюць дачыненне да права. Здараецца, яны праследуюць зусім іншыя мэты. А ўспрыманне чалавекам рэчаіснасці залежыць ад таго, якія крыніцы інфармацыі ён лічыць для сябе праўдзівымі і надзейнымі. А ў інфармацыйнай прасторы вельмі шмат фэйкаў, і бяда, калі людзі прымаюць такія звесткі за сапраўдныя і ў залежнасці ад гэтага фарміруюць свае дзеянні. Тыя ж прапановы лёгкага і вялікага заробку ў аднаго падлетка выклічуць насцярожанасць, а другі ўчэпіцца за «магчымасць». Каму ж не хочацца, умоўна кажучы, атрымаць 200 долараў за тое, што нейкую паперку пакладзеш пад пянёк. Аднак за такі сыр у пастцы мыш разлічваецца галавою, а нашы падлеткі, якія паклалі паперку, а яна была з наркотыкамі, — сваёй свабодай.

Сям'я — з васямнаццаці «Я»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Дзяўчынкі часта хварэлі. Развіццё Насцюшкі ішло нармальна, а Палінка адставала. Дыягназ «затрымка псіхічнага развіцця» падаўся прысудам. Перажывалі вельмі, — дзеліцца прыёмная мама. — Але з дапамогай доктара і нашага агульнага сямейнага клопату многае пераадолелі, усё нармалізавалася. Здавалася, ну і добра, але ў мяне з галавы не выходзіў хлопчык, якога ўбачылі ў доме дзіцяці, калі забіралі дзяўчынак. Было заўважна: дзіця моцна адставала ў развіцці — у тры гады толькі пачынала хадзіць, не размаўляла.

Так у сям'і Галіны і Юрыя з'явіўся сынок — Дзяніска. І зноў з несуцяшальным дыягназам — «разумовая адсталасць». Пачаліся рэабілітацыі, заняткі з лагапедам, бальніцы...

— Вынік у нас ёсць. Дзяніска — добразычлівы, усмешлівы, мамчын «хвосцік», вучыцца па дапаможнай праграме ў звычайнай школе, урокі робіць з задавальненнем, з многім спраўляецца сам, — расказвае аб сыне Галіна.

Так адбылося, што менавіта гэты хлопчык прывёў у сям'ю Яўмененкаў і яшчэ двух сыноў. Аказалася, што ў Дзяніскі ёсць родныя браты. Аднаго з іх, старэйшага, Андрэя, адшукалі ў Мазырскім дзіцячым доме. Забралі.

— Я адчула: дапамогуць дзеці і муж, мы зможам, — не тоіць свае душэўныя перажыванні Галіна і дадае, што, на жаль, і гэтаму хлопчыку спачатку ўрачы ставілі «затрымку псіхічнага развіцця».

Усё ў мінулым. Нягледзячы ні на што, кажа мама, сёння Андрэй — хлопец хоць куды! Вучыцца, з задавальненнем наведвае мастацкую школу.

— Упэўненая, калі на свеце ёсць «ТВАЕ» дзеці, яны абавязкова прыйдуць у тваю сям'ю, — пераканана Галіна Аляксеёўна.

Згадвае, калі на руках ужо было чацвёра прыёмных дзяцей, па грамадскіх справах наведвала дом дзіцяці і даведалася пра васьмімесячную дзяўчынку:

— Яна згасала. Была слабенькая пасля перанесенай аперацыі. Мы вырашылі, што павінны даць Міланцы шанц!

Каб забраць дзяўчынку да сябе, Галіне і Юрыю прыйшлося змяніць статус прыёмнай сям'і і стаць бацькамі-выхавальнікамі дзіцячага дома сямейнага тыпу. Адкрылі яго на базе ўласнага жылля. І ўзяліся змагацца ўжо за новае дзіцячае жыццё: дзяўчынка не сядзела, не ела цвёрдую ежу, не рэагавала на ўласнае імя. Яе лячэнне і рэабілітацыя працягваюцца і сёння. Але вынік ёсць — вучыцца дзяўчынка ў дашкольным аддзяленні спецшколы. Летась, дарэчы, шматдзетныя бацькі сваю Мілану ўдачарылі.

Пры гэтым толькі за адзін 2018 год Юрый і Галіна прынялі да сябе ў сям'ю адразу трох хлопчыкаў: сірату з сур'ёзнымі праблемамі са здароўем і двух дзяцей, ад якіх неаднойчы адмовіліся іншыя прыёмныя сем'і.

— Тэлефонны званок да мяне ад прыёмнай мамы: «Забярыце хлопчыка, я не спраўляюся, а ў вас выхоўваюцца яго браты», — гаворка ішла пра васьмігадовага Дзіму. Ён і быў трэцім брацікам нашых Дзяніскі і Андрушы, — тлумачыць Галіна Аляксеёўна.

Хлопчыка прыёмныя сем'і вярталі двойчы. Рашэнне забраць яго да сябе, каб браты раслі разам, прыняў тата — Юрый Сяргеевіч. Прызнаецца: сказаць, што было цяжка, — нічога не сказаць. На працягу года хлопчык, як кажуць, «разведваў абстаноўку»: лаяўся, хітраваў, хаміў, парушаў дысцыпліну ў школе. Сёння, кажуць бацькі, гэта спакойны, ласкавы хлопец. Любіць капацца ў агародзе, спраўляецца з любой хатняй працай. Ён — татаў «хвосцік»: разам майструюць, сталярнічаюць, рамантуюць машыну.

— У 2018 годзе ў нашай сям'і з'явіўся таксама Ваня, — працягвае аповед аб сваёй вялікай сям'і Галіна. — Ох і страшна было! Хлопца вярнулі з апякунскай сям'і. Быў на ўліку ў псіхіятра, меў стасункі з міліцыяй з-за ўцёкаў. Тут ужо за справу ўзяўся тата. Размаўляў шмат з ім як мужчына з мужчынам, тлумачыў элементарныя рэчы, прывучаў да дысцыпліны — неабходны быў пастаянны кантроль. Шмат, вядома, напярэдзе выхаваўчай работы, — прызнаецца маці-выхавальніца, — але прагрэс, несумненна, ёсць. Дарога ў псіхіятрычную бальніцу забыта, закон не парушае, у школе заўваг значна менш, і гэта, вядома, радуе.

А вось у спакойнага, паслухмянага, ласкавага Цімошы, які ў сям'і Яўмененкаў з'явіўся ў тым жа 2018-м, не было ніякай адаптацыі і праблем з паводзінамі. На жаль, у хлопчыка інваліднасць — вялікія праблемы са зрокам, расколіна верхняй губы і дзясны.

— У дзесяць гадоў нас чакае сур'ёзная аперацыя, і, дай Бог, каб адна. Цімошка — сірата, у 2019 годзе мы змаглі яго ўсынавіць, — кажа Галіна.

Расказвае яна і пра яшчэ аднаго сына, з якім два гады таму іх звязаў лёс. Падлетка вярнулі з прыёмнай сям'і.

— Агрэсіўны, халодны, суровы погляд спадылба. А калі прыгледзецца, становіцца зразумела: Колю проста недалюбілі. Мы — любілі, грэлі і адагрэлі! Цяпер гэта мамін сын і татаў памочнік. Добры вучань у школе! А яшчэ — надзейны абаронца малодшых братоў і сясцёр, — падкрэслівае з гонарам Галіна.

Крыху больш за месяц таму ў Яўмененкаў зноў адбылося папаўненне. У сям'ю прынялі браціка і сястрычку — 10 і 12 гадоў. Пакуль ідзе адаптацыя, дзецям складана, трэба час, кажа Галіна.

Яна ад усёй сваёй вялікай сям'і шчыра дзякуе дактарам, педагогам, спецыялістам аддзела адукацыі, сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы — усім, хто падтрымлівае ў нялёгкай справе. Галіна Аляксеёўна дадае: цяжка нават словамі выказаць, як за каласальную дапамогу і падтрымку яна ўдзячна свайму мужу і дзецям.

— Наш сын Станіслаў — настаўнік і класны кіраўнік у класе ў Галавінскай школе, дзе вучацца старэйшыя дзеці. Гэта вялікая падтрымка ў выхаванні. Хутка з арміі вернецца яшчэ адзін сын, Ілья, студэнт БелДУТа — таксама добры прыклад для малодшых, — зазначае шматдзетная мама. — Людзям жа, якія адчуваюць у сабе сілы падарыць дзецям сям'ю, ад сябе раю: не трэба баяцца, усе праблемы ў гэтай нялёгкай справе можна вырашыць. На свеце ж яшчэ шмат дзетак, якія хочуць «дадому», чакаюць сваіх тат і мам.

Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.

ПЕРАЗАГРУЗІЦЦА НА ДАБРЫНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Падлеткі з Азяршчынскай школы адлюстравалі праблему булінгу ў графіці «Праспект сяброўства» на агароджы ўздоўж дарогі на Рэчыцу. У Пружанах вучні стварылі псіхалагічны тэатр, а ў Мінскай гімназіі № 146 арганізавалі «жывую бібліятэку».

Школьнікі з Іванаўскай школы Брэсцкай вобласці расказалі, што ў рэалізацыі праекта ім дапамог «добры і смелы сшытак», запісы пра свае поспехі, няўдачы, думкі, эмоцыі і пачуцці ў якім робяць дзеці гэтай установы. Старшакласнікі Мінскай школы № 197 аб'ядналіся ў атрад «Адкрытыя сэрцы» і дапамагаюць педагогам, праводзячы ўрокі для вучняў 4-5 класаў. А сёлета тут пачалі стварацца службу школьнай медыяцыі.

У Гродзенскай школе вучні арганізавалі дзіцячы дыялогавы цэнтр, які развіваецца ў чатырох кірунках. Гэта арт-кафэ з псіхолагам, дзе ладзяць трэнінгі з выкарыстаннем тэхналогій арт-тэрапіі, дыскусійны клуб, валанцёрская дзейнасць і партал пазітыву ў сацыяльных сетках.

Школьнікі вельмі эмацыянальна і натхнёна дзяліліся сваімі дасягненнямі ў барацьбе з булінгам і тым, што яны для гэтага зрабілі. Аднагалосна адзначалі, што ў школе стала лепш і цікавей, а школьнае жыццё пачало нават нагадваць сям'ю, і, самае галоўнае, «разам — не страшна». Адна з удзельніц прызналася, што сама была ахвярай булінгу і, ледзьве стрымліваючы слёзы, падзякавала за існаванне такога праекта. І гэта бадай што самы яскравы доказ карыснасці праекта і абавязковай неабходнасці ў працягу.

Булінг — не ў маёй школе!

Мадэль сяброўскага і падтрымлівальнага асяродку ў школах прыйшла ў нашу краіну з Харватыі, а спецыялісты БДПУ выпрацавалі беларускую версію па стварэнні такога асяроддзя. Праект рэалізоўваецца па дапаможніку, які атрымаў грыф Нацыянальнага інстытута адукацыі. За два гады школьнікі, якія паставілі сабе задачу распазнаваць булінг і супрацьдзейнічаць яму, навучыліся адрозніваць жарт ад насмешкі, а сяброўскае пакепліванне — ад цкавання, дзяліцца вопытам і разам абмяркоўваць праблемы, каб можна было ўпэўнена сказаць: «Булінг — не ў маёй школе!». Да праекта, дарэчы, далучыліся і бацькі: падчас бацькоўскіх гадзін яны больш даведваліся, што такое булінг і як падтрымаць дзяцей.

На фестываль ад кожнай школы прыехала па дзесяць чалавек. Сем вучняў (ад шостага да адзінаццатага класа) і трое дарослых: ментар — спецыяліст, які курыраваў рэалізацыю праекта ў навучальнай установе, школьны псіхолаг ці педагог і прадстаўнік адміністрацыі школы. За два дні фестывалю падлеткі і дарослыя праз гульню, разбор сітуацый, работу ў групах азнаёміліся са створанымі праектамі, паразважалі над стасункамі ў школе і роляй псіхолага ва ўзаемадзеянні паміж падлеткамі і настаўнікамі, абмеркавалі праблемы булінгу ў інтэрнэце.

— Мы чакаем, што дзеці стануць сярод сваіх аднагодкаў праваднікамі стасункаў, вольных ад насілля і цкавання. А педагогі будуць садзейнічаць актыўнаму прасоўванню мадэлі ў школах і стварэнню ўмоў для яе рэалізацыі, — падзяліўся **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы каардынатар па пытаннях аховы дзяцінства прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН у Беларусі.**

У педагогаў значна больш кампетэнцый бачыць, чуць і разумець дзяцей, чым нават у бацькоў, таму што іх гэтаму вучылі. Але ж для паспяховай рэалізацыі праекта неабходны ўдзел усёй школы. Ментары павінны займацца не толькі з дзецьмі, але і з настаўнікамі, упэўнена **Алена ГАЛАЎНЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі:**

— Я прыемна ўражана менавіта дзецьмі, якія не адмаўляюць наяўнасць праблемы булінгу ў школе, разумеюць, што такая з'ява існуе і з ёй трэба змагацца. Нечаканым аказалася прызнанне падлеткаў, што ім прасцей «разрульваць» канфліктныя сітуацыі самім і знаходзіць у сабе рэсурс для гэтага. І толькі ў найбольш складаных сітуацыях — ісці да настаўніка. Нашы дзеці адкрытыя і свабодныя, ахвотна дзеляцца ведамі і праблемамі, і гэта таксама вынік праекта. Акрамя таго, падлеткі маюць высокую ступень даверу да педагогаў-псіхолагаў — з імі яны часам абмяркоўваць рэчы, якія не маглі б сказаць бацькам. І гэта наша задача на перспектыву — далучыць да працэсу работу з бацькамі, каб бяспечнае асяроддзе было і дома, а дзіця адчувала, што яно патрэбнае і яму ёсць з кім абмеркаваць усе пытанні. Штогод міністэрства складае план супрацоўніцтва з ЮНІСЕФ, і ўсе нашы праекты скіраваны на ахову дзяцінства. Вельмі каштоўна і важна, што адным з вынікаў фестывалю стаў Звод правіл, створаны самімі вучнямі.

Спецыялісты адзначаюць, што падчас фестывалю яны адчулі стан камфорту дзяцей, так што праект супраць булінгу набліжае ўсіх нас на адзін крок да таго, што хоча кожны ў свеце — быць шчаслівым.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

ВЫХАВАННЕ БЕЗ ПАКАРАННЯ,

або Чаму нельга біць дзяцей

Неяк, гуляючы з сынам на дзіцячай пляцоўцы, пачула злосны жаночы вокрык. Раз'юшаная маці схапіла за руку свайго сына і са словамі «як жа ты мне надакучыў!» некалькі разоў што ёсць моцы ўдарыла яго па пятай кропцы. За што — не ведаю. Але запомніла поўныя жаху вочы таго хлопчыка і яго малодшай сястры, якая ўся ў слязах кленчыла: «Мамачка, не чапай Сашку»... Адны бацькі свядома б'юць дзяцей у «выхаваўчых» мэтах, другія — ад бяссілля змагацца з іх разбуральнай актыўнасцю, трэція — ад няведання, як рабіць інакш, а чацвёртыя — таму што так рабілі іх тата ці мама, метад «бізуна і перніка» вельмі часта перадаецца ў сям'і з пакалення ў пакаленне.

Дзяцей біць нельга ні пры якіх абставінах, у адзін голас кажуць псіхолагі. Як фізічныя метады пакарання адбіваюцца на неакрэплай псіхіцы? У нашым матэрыяле — не толькі адказ на гэта пытанне, але і падказкі, як без прымянення сілы рэагаваць на правіннасці дзіцяці.

Метад «лямпавага тэлевізара»

Мне таксама ў дзяцінстве час ад часу перападала. Прыгадваю гэта як страшны сон, таму яшчэ да таго, як выйсці замуж, цвёрда вырашыла, што ніколі не падыму руку на сваё дзіця. Хоць часам стрымаць сябе вельмі няпроста. Такое адчуванне, што ў дзяцей талент — выводзіць бацькоў з сябе. Калі знаходжуся за крок да таго, каб прымяніць татаў метад выхавання, згадваю цытату, якую выпісала сабе ў нататнік на адным з вэбінараў для маладых бацькоў: «Колькі можна яму паўтараць?», «Ён сам напрасіўся», «Ён мяне давёў!» — так дарослыя апраўдваюць фізічны гвалт у адносінах да дзіцяці. Як быццам вас ніколі не даводзіў начальнік, муж, жонка, сяброўка, маці... Пры гэтым вы ж не кідаецеся на іх з рэменем? Наадварот — знаходзіце альтэрнатыўныя метады вырашэння пытанняў, неяк дамаўляецеся. Чаму ж з дзецьмі некаторыя бацькі сабе такое дазваляюць?»

«Калі вы сталі раздражнёнымі і часта зрываецеся на дзяцей, вам хутчэй за ўсё трэба заняцца не выхаваннем, а ўласным псіхалагічным здароўем, перагледзець свой рэжым дня».

«Гэта сапраўды працуе, інакш такімі прыёмамі не карысталіся б на працягу тысячагоддзяў, — піша Людміла Петраноўская ў кнізе «Таемная апора». — Але трэба разумець, што пляскач, крык, замыканне ў туалеце і Баба-яга працуюць не таму, што дзіця ўсвядоміла няправільнасць сваіх паводзін і зрабіла высновы. Яно нічому не навучылася ў гэтай сітуацыі, нічога не зразумела. Бацькі проста здолелі грубым уздзеяннем запусціць праграму выніку, падобна таму, як раней чынілі лямпавы тэлевізар, які забарахліў, — шарахнуўшы па ім кулаком. Ёсць сітуацыі, у якіх не застаецца нічога іншага, чым крыкнуць ці пляснуць, каб дзіця неадкладна паслухалася, каб не даць яму магчымасці далей бесклапотна бегчы ў бок праезнай часткі. Толькі не трэба мець ілюзіі, што ў гэты момант вы яго выхоўваеце. Нічога агульнага з выхаваннем гэта не мае».

— Калі ў вас задача чаму-небудзь навучыць дзіця, а не проста прынізіць і пакрыўдзіць, то майце на ўвазе, што нават лёгкі пляскач пазбаўляе малога здольнасці ўспрымаць інфармацыю, — тлумачыць **дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ.** — У стане стрэсу яно можа думаць толькі пра рэакцыю дарослага, а не пра тое, як палепшыць свае паводзіны. Больш за тое, фізічнае пакаранне — самы неэфектыўны метад уздзеяння, бо ніколі не прыносіць выніку. Паводзіны дзіцяці, яго ўчынкі глабальна не зменяцца. Да таго ж агрэсія бацькоў, як правіла, перадаецца. Таму з часам яны атрымліваюць яшчэ больш бескантрольныя паводзіны дзіцяці. Але дарослыя, якія прымяняюць фізічнае пакаранне, на жаль, не аналізуюць аддаленыя наступствы. Б'ючы, мы вучым дзіця падпарадкоўвацца, рабіць так, як нам зручна. Але калі малеча вырасце, яна панясе з сабой гэта ўменне. А каму ваш сын ці дачка будзе падпарадкоўвацца пасля вас — вялікае пытанне. Больш за тое, жорсткае абыходжанне з дзіцем выклікае незваротныя змены яго псіхічнага, а часам і інтэлектуальнага развіцця, фарміруе фобіі, панічныя атакі. Дзеці, якіх б'юць у дзяцінстве, у дарослым жыцці больш схільныя да дэпрэсій, розных форм залежнасцяў, суіцыду.

Безумоўна, калі дзіцяці не моцна балюча і не вельмі страшна, глабальнага ўздзеяння гэта не аказвае. Малое проста вучыцца біцца ў адказ. Таму нядзіўна, што найбольш актыўна б'юцца на пляцоўках з іншымі дзецьмі менавіта тыя хлопчыкі і дзяўчынкі, якіх так ці інакш б'юць дома.

Псіхолагі раяць адмовіцца ад усіх выхаваўчых мер, звязаных з прычыненнем болю, яшчэ і таму, што з кожным ударам парушаецца натуральная сувязь дзіцяці з бацькамі. Яно страчвае пачуццё бяспекі. А гэта базавая патрэба чалавека, падмурак для здаровага псіхалагічнага развіцця.

Дом — гэта не музей

Калі дзіця не змяшчаецца папярок лаўкі, то, кажуць, выхоўваць ужо позна. Таму, паводле слоў Людмілы Губскай, варта пачынаць рабіць гэта з нараджэння.

— Задача бацькоў — быць эмацыянальна адкрытымі. Калі дзіця штосьці нарабіла, то важна паказваць сваё расстройства, сум з гэтай нагоды. У адваротным выпадку якасць выхавання зніжаецца, бо малеча пазбаўлена арыенціраў: не ведае, што такое добра, што такое дрэнна з пункту гледжання культуры сям'і. Немаўляты вельмі назіральныя, яны добра скануюць стан бацькоў, счытваюць кожны жэст, міміку, інтанацыю і разумеюць, што яны значаць. Таму нават поза нашэння на руках мае значэнне: важна, каб дзіця заўсёды бачыла твар мамы і таты, як яны рэагуюць на тое, што адбываецца, на новую цацку, новага чалавека.

Вельмі вялікім злом з'яўляюцца ўсе блакіратары дзвярэй, шафаў. Заходзіш у сям'ю — а там усё заклеена. Дзіця не можа нікуды залезці, і бацькам не патрэбна нічога яму тлумачыць. Але гэта як у музеі. Такое дзіця зойдзе ў госці — і ў яго няма межаў. Яно зусім не разумее, што значыць словы «асцярожна», «гэта небяспечна». Чым больш бацькі тлумачаць дзецям, тым лепш. Напрыклад, залез малы на зэдлік і раз за разам выціскае сабе на ручкі вадкае мыла з дазатара. Мама з сумным тварам кажа: «Так рабіць нельга, бо нам не будзе чым мыць ручкі». Дзіця хутчэй за ўсё працягне сваю захапляльную гульню. Тады бяром яго на рукі і выносім з ваннага пакою, выключаем святло і абавязкова займаем чымсьці альтэрнатыўным, напрыклад, прапаноўваем зрабіць мыльны раствор і разам пускаць мыльныя бурбалкі.

Такой жа тактыкі прытрымліваемся, і калі ваш малы пачынае абсыпаць іншых дзетак пяском. Вядома, значна прасцей вырваць з рук лапатку і пляснуць дзіця. Яно паплача і перастане сыпаць гэты пясок на іншых. Але не назаўсёды... Калі раз за разам, прамаўляючы ўслых свае адчуванні, выносіць малечу з ваннага пакою, з пляцоўкі і штосьці прапаноўваць узамен — яно перастане паўтараць разбуральныя дзеянні. Бо ўсе дзеці прагнуць атрымліваць выключна станоўчыя эмоцыі. Так паступова дзіця навучаецца правільнаму ўзаемадзеянню.

Дзеці, якія раслі ў атмасферы ўзаемаразумення, падрастаючы, працягваюць захоўваць тэндэнцыю да ўзаемаразумення. Бацькі ж, якія прытрымліваліся прынцыпу запалохвання, хутчэй за ўсё пацерпяць фіяска. Менавіта ў падлеткавым узросце дзіця дае адпор, кажа: «Калі вы мне хоць пальцам краняце, то я буду гэта аспрэчваць у судзе». Дзеці зараз не такія, якімі мы былі раней, у іх ёсць доступ да інфармацыі, яны разумеюць свае правы.

«Жорсткае абыходжанне з дзіцем выклікае незваротныя змены яго псіхічнага, а часам і інтэлектуальнага развіцця, фарміруе фобіі, панічныя атакі».

Не лянуйцеся, шукайце альтэрнатыўныя формы выхавання. Замест таго, каб караць рэменем ці замыкаць у пакоі, падумайце разам, як выправіць сітуацыю. Напрыклад, калі дзіця раскідала цацкі або разбіла кубак, яно павінна ўсё прыбраць. Калі забылася свае падручнікі ў школе — папрасіць дапамогі ў аднакласнікаў. Накіруйце эмоцыі на вырашэнне праблемы. Некаторым сем'ям вельмі дапамагае каляндар добрых спраў. Вешаюць разлінеены ватман на халадзільнік і клеяць туды налепкі за добрыя ўчынкі. Напрыканцы месяца, напрыклад, за 40 налепак бацькі купляюць чарговага коніка, якіх дзіця калекцыянуе. У выніку ўсе пачынаюць фіксавацца на станоўчым, і паводзіны значна паляпшаюцца.

Абдыміце і папрасіце прабачэння

— Адна з маіх любімых кніг «Аскепкі дзіцячых траўм» пачынаецца так: «Неабавязкова тое, што не забівае, робіць нас мацнейшымі». Яно пакідае незабыўныя шрамы нашай псіхіцы і рана ці позна ўсё адно «стрэліць». Дзіцячыя траўмы, няважна, псіхалагічны ці фізічны гвалт, непазбежна потым праяўляюць сябе, — працягвае Людміла Губская і прыводзіць прыклад са сваёй практыкі. — Галю (імя зменена) ў дзяцінстве вельмі жорстка білі за любую правіннасць усімі падручнымі сродкамі. Неяк мама схапіла з будоўлі, якая была побач, металічны прут і адлупцавала ім сваю дачку. Прычым, як высветлілася пазней, за тое, што дзяўчынка не рабіла. У выніку дзяўчынка выраслі і свядома не нараджае дзяцей, у яе галаве склаўся стэрэатып, што яна будзе дрэннай мамай. Сваімі думкамі яна правакуе псіхалагічнае бясплоддзе.

Калі вы ўсё ж такі сарваліся і на эмоцыях далі сваёй крывіначцы плескача, не дакарайце сябе, лепш папрасіце прабачэння і абдыміце. Дзіцяці важна адчуваць, што яго па-ранейшаму любяць і прымаюць. Патлумачце, чаму вы раззлаваліся. Пры гэтым у любой сітуацыі ацэньвайце непасрэдна дзеянні. Галоўны пасыл павінен быць не «ты дрэнны», а «ты зрабіў дрэнны ўчынак». Адчуваеце розніцу?

«Фізічнае пакаранне — самы неэфектыўны метад уздзеяння, бо ніколі не прыносіць выніку. Паводзіны дзіцяці, яго ўчынкі глабальна не зменяцца».

А наогул, калі вы сталі раздражнёнымі і часта зрываецеся на дзяцей, вам хутчэй за ўсё трэба заняцца не выхаваннем, а ўласным псіхалагічным здароўем, перагледзець свой рэжым дня. Бо правіла «задаволеныя бацькі — шчаслівыя дзеці» — ніхто не адмяняў.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Як сябе стрымаць, каб не ўдарыць?

1) Лічыце да трох. Апусціцеся на ўзровень дзіцяці і загінайце перад яго тварам пальцы са словамі: «Адзін: мне не падабаецца, што ты робіш. Два: я пачынаю злавацца. Тры: я злуюся». Пакуль вы лічыце, гнеў крыху астыне.

2) Мяняйце ракурс. Калі вам не падабаецца, як сябе паводзіць дзіця, у момант гневу павярніцеся да яго бокам. Калі глядзець не прама, а скоса, справіцца са сваімі эмоцыямі будзе прасцей.

3) Насіце на запясці гумку. У момант, калі пачынаеце злавацца, адводзьце яе ўбок і адпускайце. Пераключэнне на фізічныя адчуванні, дапамагае фіксавацца не на капрызах дзіцяці, а на сваіх адчуваннях.

4) Прасіце дапамогі. Калі мама адчувае, што выходзіць з сябе, лепш за ўсё папрасіць тату, які сядзіць за камп'ютарам, замяніць яе на хвілін 20. А самой, замест таго, каб выходзіць з сябе, варта выйсці прагуляцца, падыхаць свежым паветрам. Такі метад цудоўна дапамагае ўсім пераключыць увагу. Але пра гэты варыянт дарослым трэба дамовіцца загадзя.

ЗАКАХАНЫ ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

Сем стадый, якія праходзіць мужчына, перш чым зразумець, што вы — тая самая...

Усе самыя вялікія памылкі ў зносінах з мужчынамі мы, жанчыны, дапускаем тады, калі думаем, што яны адчуваюць і думаюць таксама, як і мы. Але гэта зусім не так. Псіхолагі вылучаюць сем стадый, якія праходзіць мужчына, перш чым закахацца па-сапраўднаму. Калі жанчына ўпершыню бачыць мужчыну, то мімаволі пачынае яго ацэньваць па наступных параметрах: інтэлект, магчымасці, таленты, дагледжанасць. Мы імгненна імкнёмся вызначыць, да якога сацыяльнага статусу ён належыць. Усё гэта мы робім неўсвядомлена — так уладкаваны наш мозг. Мужчыны ж у сваю чаргу, калі ўпершыню бачаць дзяўчыну, ацэньваюць толькі тое, наколькі яна фізічна прывабная менавіта для яго. Такім чынам, мужчыны і жанчыны пачынаюць кахаць адно аднаго па-рознаму. Разуменне гэтай розніцы дазволіць выбудаваць сапраўды трывалыя адносіны з правам на шчаслівую будучыню.

Якія ж стадыі праходзяць мужчыны?

1. Знешняя прывабнасць. Што ні кажы, знешняя прыгажосць мае вялікае значэнне. Знешнасць — гэта першае, што прыцягвае і зацікаўлівае. Такая мужчынская прырода і псіхалогія. І ў кожнага ёсць свае перавагі, свой ідэал жанчыны. Часам нават самі мужчыны не могуць сфармуляваць, што менавіта ім падабаецца ў канкрэтнай дзяўчыне. Але адназначна, кожнаму з іх прыемна быць на вышыні ў кампаніі прыгожай дамы. Так яны адчуваюць перавагу перад сваім асяроддзем: «Чым прывабней мая жанчына, тым больш упэўнены ў сабе я». Але таксама важна разумець, што кахаюць усё ж не за знешнасць, бо адной толькі знешнасцю сімпатыя не абмяжоўваецца. З прыгажосцю вельмі хутка звыкаешся, і ў нейкі момант яна паступова адыходзіць на другі план. Больш важную ролю, зразумела, маюць асабістыя якасці: прыязнасць, пачуццё гумару, інтэлект.

Паводле даследавання, чым даўжэй погляд мужчыны пры першай сустрэчы затрымліваецца на жанчыне, тым большую цікавасць яна ў яго выклікае.

2. Прыцягненне. Калі ўпадабаная дзяўчына адказвае ўзаемнасцю на ўвагу мужчыны, то яго цікавасць узмацняецца і пераходзіць на другую стадыю — прыцягненне. Менавіта на гэтай стадыі ён прымае рашэнне — заваёўваць дзяўчыну ці не. Варта мець на ўвазе, што ў мужчыны яшчэ няма глыбокіх пачуццяў і прыхільнасці, таму ён можа зусім лёгка і без глыбокіх перажыванняў расстацца з ёй, калі яна раптоўна адмовіць.

Дарэчы, мужчыну можа падабацца адначасова некалькі жанчын. Ён можа аказваць пэўныя знакі ўвагі кожнай з іх для таго, каб канчаткова высветліць, якая з іх рэагуе на яго цікавасць.

3. Заваёўванне. На гэтай стадыі ўсё, пра што турбуецца мужчына, — як прымусіць яе закахацца. І ён не супакоіцца, пакуль не будзе ўпэўнены, што дасягнуў сваёй мэты. Ён усяляк спрабуе ўразіць: запрашае на спатканні, клапоціцца, ахоўвае, купляе падарункі. Гэта той самы перыяд, які жанчынам падабаецца найбольш за ўсё. І, вядома, хацелася б, каб ён не заканчваўся. Бо менавіта зараз мужчына імкнецца паказаць сябе ў самай выгаднай пазіцыі: які ён моцны, клапатлівы, цікавы. Менавіта ў гэты перыяд жанчына можа адчуваць сябе каралевай, паколькі атрымлівае дастаткова эмоцый, часу, фінансавых укладанняў і ўвагі з боку прыхільніка. Як толькі ён зразумее, што дзяўчына закахалася, тады і пачне сур'ёзна задумвацца, ці хоча мець адносіны з ёй. На гэтым этапе дзяўчына можа сапраўды адчуць каханне, а вось мужчына — яшчэ не.

Не спакушайцеся пры першых праявах увагі з боку мужчыны. І не паказвайце сваю вялікую цікавасць на дадзеным этапе заляцанняў. Няхай партнёр сумняваецца ў вашых пачуццях. Гэта прымусіць яго мацней праяўляць свае якасці.

Псіхолагі раяць не прымаць у гэты перыяд важных рашэнняў, бо хутка неверагоднае адчуванне эйфарыі можа прайсці, а закаханасць зменіцца перанасычаннем.

4. Павага. Калі партнёр бачыць, што дзяўчына вартая яго павагі, ён будзе імкнуцца яе скараць. Бо для самога мужчыны запатрабаванне ў павазе стаіць на першым месцы, таму ён і на жанчыну праецыруе гэтую якасць. Тут усё проста: ён не можа кахаць жанчыну, якую не паважае. А паважае толькі тады, калі яна паважае сябе і транслюе сваю жаноцкасць. На гэтай стадыі мужчына пачынае ўсведамляць, што з гэтай жанчынай ён адчувае сябе асабліва, не так, як з іншымі, разумее, што яна вартая яго часу, намаганняў, увагі і кахання. Як ніколі раней, ён шануе, што ў яго ёсць, і не хоча страчваць гэта.

5. Давер. Давер — гэта адкрытыя ўзаемаадносіны, пабудаваныя на ўпэўненасці ў прыстойнасці і надзейнасці партнёра. У большасці адносін давер ідзе за павагай. Многія мужчыны схільныя захоўваць сваё эмацыянальнае мінулае ў сабе. Але калі мужчына сур'ёзна зацікаўлены ў жанчыне, то абавязкова захоча падзяліцца з ёй усім тым важным, што было і ёсць у яго жыцці. Такім чынам, калі мужчына адчувае, што гэта жанчына — для яго, ён не баіцца адкрыць сваё сэрца. Яму хочацца дзяліцца сваімі планамі, расказваць пра свае мэты і намеры, бо для яго важнае яе меркаванне.

Менавіта зараз ён ацэньвае, якія вынікі прынеслі ўсе яго дзеянні, наколькі моцна дзяўчына прывязалася і закахалася — гэта значыць, яна ўсміхаецца, яна шчаслівая і ёй добра разам з ім. І здавалася б, што ўсё добра.... Але толькі зараз мужчына падыходзіць да прыняцця рашэння. Усе заляцанні, увага, спатканні і кветкі раптам кудысьці знікаюць.

6. Сумненні. Гэтая стадыя павінна быць абавязкова! Хоць усё ідзе ў патрэбным напрамку і складваецца лёгка, большасць мужчын пачынаюць сумнявацца ў сабе і сваіх адносінах. Калі ён разумее, што ўлюбляецца, першае, што адчувае, — гэта адмаўленне. Бо хлопцы, якія не прывыклі да сур'ёзных адносінаў, не жадаюць прымаць факт, што ў іх жыцці з'явілася асаблівая жанчына. Яны звычайна спрабуюць сказаць сабе, што гэта проста чарговая інтрыжка. Таму што не гатовыя прызнаць, што сталі слабымі, што закаханасць робіць іх такімі. Мужчына ўвесь час задае сабе пытанні: ці сапраўды я яе кахаю? Ці буду я шчаслівы з ёй? І з-за пастаянных сумненняў псіхіка яго ў гэты перыяд дзейнічае па прынцыпе набліжэння і аддалення. Бо ў мужчыны аўтаматычна чаргуюцца дзве патрэбы: то блізкасці, то незалежнасці. Чым больш ён аддаліцца, тым з большай сілай потым прыцягнецца.

Памятайце: калі мужчына аддаляецца, жанчыне важна заставацца спакойнай. Не варта прад'яўляць прэтэнзіі, калі ён праяўляе менш увагі.

Менавіта зараз як ніколі мужчын адольвае страх. Яны баяцца, што недастаткова добрыя, і ў той жа час баяцца, што ім будзе балюча, бо яны ўжо даверыліся гэтай жанчыне. Таму адчуваюць сябе ўразлівымі. На гэтай стадыі многія хлопцы спрабуюць збегчы, але ў рэшце рэшт разумеюць, што дзяўчына каштоўная для іх і страх страціць яе перавышае ўсе астатнія.

7. Прыняцце. Стадыя, на якой большасць мужчын усведамляе, што гэтая незвычайная жанчына — адна на мільён. Ён, нарэшце, разумее, што яна — найлепшае, што магло з ім здарыцца. Гэтая жанчына зараз частка яго, і ён не можа ўявіць сваё жыццё без яе. Партнёр будзе прапаноўваць дапамогу, аказваць належную ўвагу і ўласна вырашаць вашыя праблемы. Прымаючы важныя рашэнні, закаханы мужчына заўсёды параіцца са сваёй жанчынай, бо яму важна ведаць яе меркаванне, яе інтарэсы стануць прыярытэтнымі.

Памятайце: калі вы хочаце завяваць яго сэрца і зрабіць так, каб ён меў патрэбу ў вас, варта прымушаць дамагацца вашага кахання. Чым больш мужчына ўкладвае сваіх рэсурсаў (час, грошы, энергія, эмоцыі) у зносіны з вамі, тым мацней ён шануе вас як жанчыну.

Алена ШАЎЧЭНКА.

Нататкі шматдзетнага таткі

У нашым цырку — аншлаг!

Малодшая дачка з'ела цюбік фруктовага пюрэ і адразу ж папрасіла цукерку.

Мама ёй кажа:

— Ксенія, ты толькі што цэлы пачак салодкага пюрэ з'ела, у цябе ўвогуле сумленне ёсць?

Гляджу, дзіця задумалася.

Пытаюся ў яе:

— Ксенія, а ты ведаеш, што такое «сумленне»?

— Не.

— Калі ў чалавека няма сумлення, ён можа з'есці вельмі многа цукерак.

Ксенія радасна:

— Мама, дай мне цукерку, у мяне няма сумлення!

Але тут раптам высветлілася, што сумленне ёсць у мамы, і маміна сумленне не дазволіла ёй даць дачцэ лішнюю цукерку. Таму для шчасця мала проста не мець сумлення, трэба яшчэ, каб яго не было ў навакольных.

P. S. А ўвогуле, як гэта цудоўна — на пытанне «А ты ведаеш, што такое сумленне?» шчыра і радасна адказаць «Не».

***

Старэйшай дачцэ сяброўка падарыла на дзень нараджэння кігурумі.

Хто не ведае, кігурумі — гэта такая піжама-камбінезон у выглядзе жывёлы. У нашым выпадку ў выглядзе аднарога. Дачка надзела гэта самае кігурумі з рогам на лбе і стала ганяцца за малодшымі сёстрамі.

Калі яны набегаліся, самая малодшая, Ксюша, падышла да яе і кажа:

— Марта, а можаш ператварыцца ў каго-небудзь яшчэ?

— Магу ператварыцца ў Ксюшу.

Пасля чаго зрабіла капрызны тварык, стала дрыгаць рукамі-нагамі і крычаць агідным голасам: «Хачу мульцікі! Хачу цукерку! Хачу мульцікі! Хачу цукерку!»

Ксенія паглядзела на гэта збянтэжана, пасля чаго сказала ціхім голасам:

— Ладна, пайду я ўжо...

Усё ж карысна хоць бы час ад часу глядзець на сябе збоку.

P. S. Касцюм аднарога — гэта, вядома, цудоўна, але ў нашым цырку і без аднарогаў заўсёды быў поўны аншлаг.

***

Купіў учора ў краме шакаладку. Паклаў на халадзільнік (праверанае месца!), думаю: вечарам з чаем з'ем. Вечарам вяртаюся дадому, хачу ўзяць шакаладку, але на халадзільніку ёсць усё, акрамя яе.

На ўсякі выпадак зазіраю за халадзільнік — бывае, туды што-небудзь правальваецца. Але там таксама нічога няма.

Кажу дзецям:

— Дзеці, вы шакаладку не бачылі?

— Неа.

Жонка:

— Там нейкая абгортка ад шакаладкі ў сметніцы валяецца, не ад тваёй выпадкова?

Гляджу: дакладна, ад яе, роднай.

Кажу дзецям:

— Ну што, прызнавайцеся: як дзялілі?

Поля:

— Я толькі адзін квадрацік з'ела.

Вера:

— Я таксама адзін.

Марта:

— Я два.

Ксенія паказвае тры пальцы: значыць, тры квадрацікі з'ела.

Жонка і тая ўспомніла, што дзеці яе часцявалі. Карацей, халадзільнік як месца захоўвання каштоўных прадуктаў сябе цалкам дыскрэдытаваў.

Але самае крыўднае іншае: дзеці палічылі, колькі яны з'елі квадрацікаў, аднялі гэтую колькасць з агульнай колькасці квадрацікаў у шакаладцы, і заявілі, што палову шакаладкі ўмалоў я!

У выніку я аказаўся яшчэ і вінаваты, што «ўмяў» большую частку шакаладкі. Карацей, я прыйшоў да высновы, што такія рэчы, як шакаладка, дадому ўвогуле прыносіць нельга: дзеці яе лёгка знаходзяць у любым патаемным месцы — проста па паху.

У ідэале шакаладку трэба есці проста на месцы — у краме, не даходзячы да касы, але там могуць з'явіцца іншыя пытанні.

P. S. Так я застаўся гэтым разам без запаветнай шакаладкі. Затое прыдумаў новы фразеалагізм: «Жуй шакалад, не даходзячы да касы».

Павел ХОЛАД.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Унитарное предприятие «Калинковичский молочный комбинат», Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Суркова, 10**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов
Месторасположение: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Коммунальная, 87 и Петриковский р-н, севернее города Петрикова

Производственная база в составе: **мойка транспорта** (335/С-102896, общ. пл. 92,5 кв. м), **здание котельной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6633, общ. пл. 380,2 кв. м, составные части: две пристройки), **здание цеха, одноэтажное, кирпичное** (335/С-102896, общ. пл. 2 125,7 кв. м, составные части: шесть пристроек), **здание склада – ангара, одноэтажное, кирпично-металлическое с тремя нежилыми изолированными помещениями** (335/С-6628, общ. пл. 523,9 кв. м), **здание компрессорной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6634, общ. пл. 301,2 кв. м, составные части: пристройка), **здание конторы, одноэтажное, кирпичное, окрашенное** (335/С-6631, общ. пл. 347,2 кв. м, составные части: терраса), **проходная** (335/С-102936, общ. пл. 9,5 кв. м), **здание КНС, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6630, общ. пл. 12,2 кв. м), **трансформаторная подстанция** (335/С-102897, общ. пл. 42,6 кв. м, составные части: трансформаторная подстанция), **асфальтовая дорога к навесу с дезбарьером** (335/С-102916, общ. пл. 187,0 кв. м, составные части: асфальтовая дорога к навесу с дезбарьером), **отстойник** (335/С-102919, общ. пл. 27 955,9 кв. м, составные части: отстойник), **отстойник 2-х ярусный** (335/С-102920, общ. пл. 40,0 кв. м, составные части: отстойник 2-х ярусный), **навес с дезбарьером** (335/С-102900, составные части: навес с дезбарьером), **забор кирпичный** (335/С-102898, составные части: забор кирпичный), **забор железобетонный** (335/С-102917, составные части: забор железобетонный), **забор железобетонный** (335/С-102918, общ. пл. 1075,0 кв. м, составные части: забор железобетонный), **автодороги внутризаводские** (335/С-102899, общ. пл. 5 449,5 кв. м, составные части: автодороги заводский), **трубопровод из труб из полимерных материалов** (335/С-789604, общ. пл. 220,3 кв. м, составные части: А-Трубопровод из труб из полимерных материалов), **тепловые сети** (335/С-789602, общ. пл. 18,9, составные части: П-Тепловые сети), **кабель подземный** (335/С-78960, составные части: Т-Кабель подземный), **напорная канализация** (335/С-70936, составные части: трубопровод напорный, протяженность 108 м трубопровод напорный протяженность 282 м, трубопровод напорный протяженность 80 м), **сеть канализационная** (335/С-789603, общ. пл. 247,0 кв. м, составные части: С-Сеть канализационная), **сеть водопроводная** (335/С-789605, общ. пл. 21,0 кв. м, составные части: Р-Сеть водопроводная), **гараж** (335/С-789639, общ. пл. 208,0 кв. м), **склад ГСМ** (335/С-789635, общ. пл. 31,1 кв. м), **склад металлический** (335/С-789637, общ. пл. 17,2 кв. м), **склад металлический** (335/С-789636, общ. пл. 17,2 кв. м), **здание мазутонасосной, одноэтажное, кирпично-металическое** (335/С-6632, общ. пл. 48,8 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789634, общ. пл. 20,3 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789638, общ. пл. 19,7 кв. м), **труба дымовая кирпичная** (335/С-789632, общ. пл. 11,0 кв. м), **труба дымовая металлическая** (335/С-789633, общ. пл. 1,0 кв. м), **резервуар пожарный** (335/С-789628), **башня водонапорная** (335/С-789629, общ. пл. 13,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789630, общ. пл. 28,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789631, общ. пл. 28,0 кв. м)

Сведения о земельном участке 1: предоставлен продавцу для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода на праве постоянного пользования пл. **2,6614 га**. ***Сведения о земельном участке 2:*** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания очистных сооружений (для размещения объектов коммунального хозяйства) на праве постоянного пользования пл. **4,3024 га**

В состав лота входит иное имущество, перечень которого размещен на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 597 059,98 бел. руб. (снижена на 35 %). Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 5 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: 100 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **1 (один) процент** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.05.2022 г.

